№№155–156
(3492–3493)

11 кастрычніка 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

У СОСЕДЕЙ

Снова Туск?

В Польше прошли выборы в парламент.

А в ближайшее время будет сформирован новый Кабинет министров.

Его должен возглавить лидер партии, победившей в воскресенье на парламентских выборах. И, судя по всему, сенсации не случится, хотя это и создаст прецедент: Польша может остаться с новым старым премьер-министром — Дональдом Туском, который станет первым польским премьером, усидевшим в своем кресле два срока.

Однако стоит отметить, что интрига этих выборов сохранялась до последнего, хотя поляки эту предвыборную кампанию называют самой спокойной в истории современной Польши. За все время предвыборной гонки случился только один громкий скандал, когда лидер оппозиционной партии "Закон и справедливость" Ярослав Качиньский намекнул, что канцлер Германии Ангела Меркель — ставленница Штази. Это заявление лидера партии сразу же лишило "Закон и справедливость" нескольких процентов голосов. И за день до голосования, согласно опросам общественного мнения, разрыв между основными претендентами на победу — партией Дональда Туска "Гражданская платформа" и оппозиционной партией "Закон и справедливость" достигал почти 10 процентов, хотя последние пару недель предвыборной гонки они шли бок о бок.

Как свидетельствует предварительный подсчет голосов, победила на выборах "Гражданская платформа". За нее проголосовало примерно 39 процентов избирателей. "Закон и справедливость", возглавляемая Ярославом Качиньским, по предварительным данным, набрала 30 процентов.

Но что любопытно — из соперников конкурирующие партии могут стать соратниками. Согласно польскому законодательству, правительство страны формирует партия, победившая на парламентских выборах. По ее же предложению глава государства назначает премьер-министра, кандидатуру которого затем утверждает нижняя палата парламента (Сейм). Но в Сейме у представителей "Гражданской платформы" не будет большинства. Следовательно, нужно искать соратников, рассчитывать на коалицию с какой-либо другой партией. Таковой и могла бы стать партия "Закон и справедливость". Хотя польские политологи уверены: дружба между партиями Туска и Качиньского вряд ли случится. Похоже, самым вероятным вариантом коалиции будет союз правящей партии и PSL — это партия вице-премьера страны Вальдемара Павляка, которая прошла в парламент с 9,5% голосов.

К слову, Ярослав Качиньский уже признал свое поражение и заявил, что его партия постарается победить на следующих выборах. И это главная особенность, которая отличает польские выборы от белорусских: ни у кого из участников предвыборной гонки в Польше нет сомнения в том, что кампания прошла прозрачно, без фальсификаций, что голоса избирателей были честно подсчитаны.

Нет сомнения в справедливости парламентских выборов и у польских избирателей. Этот вопрос здесь даже не обсуждается. Единственное, что беспокоило власти, — это как повысить политическую активность населения, сделать все, чтобы поляки пришли на избирательные участки. Всевозможные общественные организации, фонды проводили кампании, направленные на участие поляков в выборах. И все равно в нынешних парламентских выборах, по предварительным сведениям, приняло участие менее 50 процентов от общего числа избирателей.

В следующем номере "Народной Воли" мы подробно расскажем о том, как проходили парламентские выборы в Польше, чем отличаются аналогичные кампании у них и в нашей стране.

Мария ЭЙСМОНТ.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Туск подтвердил свои слова

9 октября в Варшаве премьер-министр Польши Дональд Туск подтвердил белорусским журналистам, что западная помощь нашей стране может превысить 9 миллиардов долларов, но только при выполнении условий по демократизации страны.

Напомним, что ранее такая сумма со ссылкой на Дональда Туска уже озвучивалась. Но Александр Лукашенко сказал, что "это лишь утка".

Тем не менее Дональд Туск подтвердил появившуюся в СМИ информацию.

"Я убежден в том, что после наших консультаций с большинством руководителей демократического мира помощь Беларуси может даже превысить 9 миллиардов долларов", — сказал он. И подчеркнул, что такая помощь возможна лишь в случае выполнения условий, касающихся соблюдения прав человека, демократических свобод и свободных выборов.

После голосования на одном из избирательных участков Варшавы по выборам в польский сейм Дональд Туск выразил надежду, что *"Беларусь также дождется свободных и справедливых выборов — таких, как в Польше"*.

Ізноў санкцыі

Савет міністраў замежных спраў Еўрасаюза прыняў у панядзелак у Люксембургу рашэнне аб узмацненні абмежавальных мер супраць Беларусі.

У прыватнасці, Савет ЕС дадаў да ранейшага "чорнага спісу" прадстаўнікоў улад Беларусі яшчэ 16 асоб, якім забараняецца ўезд у краіны Еўрасаюза і чые банкаўскія актывы ў Еўропе замарожваюцца.

Гэтых людзей у Еўрасаюзе лічаць адказнымі за працяг рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці, палітычнай апазіцыі і незалежных СМІ.

Савет ЕС таксама падоўжыў дзеянне раней прынятых супраць Беларусі санкцый да 31 кастрычніка 2012 года. Гэтае рашэнне разам з дадатковым спісам беларускіх чыноўнікаў будзе апублікавана ў "Афіцыйным часопісе" ЕС 11 кастрычніка, пасля чаго ўступіць у сілу. Пакуль вядома толькі тое, што ў спіс трапілі суддзі, якія апошнім часам выносілі рашэнні аб арышце грамадскіх актывістаў.

Някляеву пагражаюць «рэальным» тэрмінам

Былы кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў 10 кастрычніка ў другі раз быў папярэджаны крымінальна-папраўчай інспекцыяй Ленінскага раёна Мінска аб недапушчальнасці парушэння рэжыму адбыцця пакарання. І пра тое, што суд можа ператварыць умоўнае пакаранне ў рэальнае.

— У дзень сходу, 8 кастрычніка, да мяне міліцыя здзейсніла аж тры візіты: перад сходам, пасля сходу і бліжэй да ночы, — расказаў палітык. — *У адзін з візітаў мне і прынеслі позву з'явіцца 10 кастрычніка ў 11 гадзін у крымінальна-папраўчую інспекцыю. І там у панядзелак вынеслі другое афіцыйнае папярэджанне за тое, што я парушыў умовы адбывання пакарання. І што для мяне як злоснага парушальніка ўмоў суд можа ўмоўнае пакаранне зрабіць рэальным. Я напісаў у адказ, што я вольны чалавек, не прызнаю сябе злачынцам, не прызнаю папярэджанне і не прымаю.*

КОМУ ВЕРИТЬ?

Белорусское телевидение, 9 октября:

"Разговоры об очередной уличной буче начались сразу после того, как Европа пообещала белорусской оппозиции 87 миллионов евро. Желающих присосаться к финансовому роднику было хоть отбавляй, но в тендере всех обошла группа товарищей, которая придумала акцию под громким названием "Народный сход". Они пообещали спонсорам вывести на улицы такое море людей, что на Западе просто ахнут. В европейские столицы тут же полетели депеши с прайс-листами.

Вот детальный план заявленного мероприятия директору немецкого фонда Маршала Йоргу Форбригу, который уже успел засветиться в подготовке декабрьских беспорядков. Виктор Ивашкевич клятвенно обещает спонсору вывести на улицы 30 городов минимум 100 тысяч протестующих, но для этого всего-то нужно 340 тысяч долларов. "Разблюдовка" прилагается. 140 тысяч долларов на листовки и газету, 20 тысяч долларов на налепки и 30 тысяч на эсэмэски.

В силу известной вороватости оппозиционной публики спонсорам просто пускали пыль в глаза. На деле же листовок напечатали ровно столько, чтобы для видимости их приложить к финансовым отчетам. Львиную долю гранта разделить между собой. Разумеется, за дележом иностранной матпомощи ни у кого не было желания идти к людям и объяснять, что за сход такой и какие у него цели".

Віктар Івашкевіч, суарганізатар акцыі "Народны сход":

— Я не бачыў гэтага сюжэту, але скажу, што ўсё гэта шчырая лухта. Грошай на Народны сход не было. Уся падрыхтоўчая кампанія будавалася на ахвяраваннях людзей. Па шчырасці скажу, мы толькі ў самы апошні момант знайшлі магчымасць надрукаваць 600 тысяч улётак, што і было зроблена. 40 тысяч газет, прысвечаных Народнаму сходу, былі сканфіскаваны напярэдадні мерапрыемства — 7 кастрычніка. Заяўкі на 340 тысяч долараў не было ў прыродзе. Гэта поўная лухта. Па БТ маглі сказаць што заўгодна, назваць нейкія астранамічныя сумы, як гэта рабілася пасля прэзідэнцкіх выбараў. Падобныя сюжэты — спроба дыскрэдытаваць. Паказаць, што ўсё, што супраць улады, робіцца за грошы, нехта іх бярэ, іншым не дае... Да гэтага нельга ставіцца сур'ёзна. Тыя, хто ўдзельнічаў у падрыхтоўцы да Сходу, ведае, як гэта рабілася — з апошніх сіл і на апошнія сродкі саміх людзей. Шчыра скажу, у падрыхтоўцы да мерапрыемства па ўсёй краіне прымала ўдзел не больш за 300 чалавек, пры тым што нашы апазіцыйныя партыі маюць у спісах па некалькі тысяч сябраў...

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

Чаму Народны сход не стаў народным?

У дажджлівую суботу 8 кастрычніка на прызначанае арганізатарамі месца мерапрыемства — сталічны парк Дружбы народаў — прыйшлі некалькі соцень чалавек. Сярод іх былі прадстаўнікі маладзёжных структур, некаторыя партыйныя лідары і грамадскія актывісты. Выступоўцы распавялі пра затрыманні актывістаў у рэгіёнах, дзе планаваліся аналагічныя сходы, распавялі пра сітуацыю ў краіне і зачыталі тэкст рэзалюцыі з патрабаваннем стабілізацыі эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў краіне. Палітычныя дзеячы тлумачылі малую колькасць удзельнікаў Народнага сходу тым, што людзі пакуль не гатовыя выйсці на такое мерапрыемства, што грамадства напалохана. І так далей, і таму падобнае...

У вечаровых аналітычных праграмах БТ не пашкадавала эфірнага часу для сюжэту пра акцыю. Шмат слоў было сказана пра няўдаласць гэтай ідэі. Каб надаць большую пераканаласць сваім словам, аўтары задзейнічалі значна больш аўтарытэтную крыніцу, чым свае дзяжурныя палітолагі — гледачам прапанавалі цытату **Зянона Пазьняка:** маўляў, не верыце — дык глядзіце, што вам разумны чалавек кажа.

Цытата, натуральна, была вырвана з агульнага кантэкста, які раней быў прысвечаны тэме маўклівых акцый, але асноўны сэнс застаўся, па-сутнасці, без змен. Зянон Пазьняк заклікаў беларускіх грамадзян устрымацца ад акцый кшталту "вечароў апладысментаў" да асобага моманту.

"Выйсці на вуліцы, каб перамагчы, можна будзе толькі адзін раз. Нельга ўжо цяпер выходзіць бязмэтна па сто чалавек, прафанаваць падзеі, зняверваць і засвечваць актыўных людзей. Неабходна сто тысяч, гатовых змагацца. Бяромся за працу, асвету і падрыхтоўку... Беларусы не павінны больш паддавацца на правакацыі, выходзіць на вуліцы нешматлікімі групамі, падстаўляць свае твары пад фільмаванне ворагаў Беларусі. Выйсці трэба тады, калі настане час. Гэты час будзем набліжаць", — пісаў палітык. Праўда, Зянон Пазьняк пакуль не сказаў галоўнага — калі ж настане гэты самы час? Тым не менш думка зразумелая. "Народная Воля" пацікавілася ў палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, ці падзяляюць яны меркаванне Зянона Пазьняка?

Палітык **Вінцук Вячорка** лічыць: *"Трэба вітаць колішнюю ініцыятыву і паказваць, што ў грамадстве ёсць людзі, якія ўжо не хочуць адседжвацца. Мне гэта прыгадвае казачнага рускага Івана, які ляжаў на печы і назапашваў сілушку. Але беларускі менталітэт прадугледжвае штодзённую працу. Штодзённая праца дае вынік: хай сабе і невялікія выхады, але рыхтуе выхады паваротныя. Нельга Народны сход гэтай суботы лічыць звычайнай акцыяй апазіцыі. Гаворка вядзецца пра балючыя сацыяльна-эканамічныя праблемы. Людзі даспяваюць да разумення, якім чынам іх трэба вырашаць".*

Старшыня "Праваабарончага альянсу" (зарэгістраваны ў Літве) **Людміла Гразнова** лічыць, што ў словах Пазьняка ёсць доля праўды. *"Дробныя акцыі вядуць да таго, што ўлады абсалютна спакойна косяць зялёную траву — арыштоўваюць, збіваюць удзельнікаў такіх акцый. І рабіць гэта ім няцяжка. Калі ж размова ідзе пра буйную акцыю, то яны вымушаны лічыцца з вялікай колькасцю людзей і будаваць іншую стратэгію. Запалохаць "хапуном" у такой сітуацыі значна складаней. Але для таго, каб выйшла вялікая колькасць людзей, трэба правесці вялікую працу. Трэба яшчэ і мець згоду паміж лідарамі, і зацікавіць электарат простымі лаканічнымі лозунгамі, якія адпавядаюць іх інтарэсам і спрыяюць вырашэнню іх праблем. У бліжэйшай перспектыве такім стымулам будуць парламенцкія выбары".*

Павел Севярынец, які цяпер адбывае пакаранне за Плошчу, арганізоўваў у свой час дзясяткі маладзёжных вулічных акцый. Ён выказаў наступнае меркаванне: *"Трэба пагадзіцца з Зянонам Пазьняком у тым, што вырашальная акцыя можа быць адна. Але я не ўяўляю Беларусь і без каляндарных акцый, як Дзень Волі, "Чарнобыльскі Шлях, "Дзяды". Мяркую, што трэба рыхтавацца да галоўнай акцыі, але для гэтага трэба спрыяць наладжванню сувязяў паміж людзьмі, развіваць салідарнасць у грамадстве".*

Адзін з лідараў кампаніі "Гавары праўду" **Андрэй Дзмітрыеў** выступіў з той жа прапановай, што і Зянон Пазьняк.

— Сёння вельмі добры момант, каб перастаць рабіць добрую міну пры дрэннай гульні. Я кажу ў тым ліку і пра кампанію "Гавары праўду", таму што мы таксама з'яўляліся членамі аргкамітэта Народнага сходу. Галоўны ўрок гісторыі для нас у тым, што мы не робім ніякіх урокаў для сябе. А мы проста абавязаны зрабіць урокі.

Па-першае, трэба прызнаць, што старымі метадамі мы больш нічога дамагчыся не можам. Мы не можам вывесці на вуліцу нават сваіх актыўных прыхільнікаў, не кажучы ўжо пра новых людзей.

Па-другое, сёння апазіцыя павінна ў прынцыпе задацца пытаннем: а ці варта скакаць на плошчу без усялякіх шанцаў на поспех? Мне здаецца, апазіцыя павінна аб'явіць мараторый на вулічныя акцыі і засяродзіцца на працы з насельніцтвам. Да таго часу, пакуль мы не будзем упэўнены ў тым, што зможам вывесці на вуліцу дастатковую колькасць людзей хоць бы для дэманстрацыі нашай падтрымкі.

Па-трэцяе. Апраўдвацца прэвентыўнымі затрыманнямі, дрэнным надвор'ем і страхам людзей — гэта некарэктна, гэта значыць прызнацца, што мы нічога не планавалі. Бо першапачаткова было вядома, што перад кожнай акцыяй будуць прэвентыўныя затрыманні. І трэба арганізоўваць акцыі так, каб не ставіць іх пад стопрацэнтную рызыку. Такая дрэнная акцыя, як 8 кастрычніка, збівае хвалю народнага пратэсту, дыскрэдытуе саму ідэю народнага пратэсту. Таму мы павінны выпрацаваць доўгатэрміновы план працы з насельніцтвам. Спачатку мы павінны пераканаць людзей: за што і чаму? І толькі потым выводзіць іх на вуліцу.

Але палітыкі зноў не чуюць адзін аднаго. Арганізатары Народнага сходу заявілі, што чарговая акцыя адбудзецца 12 лістапада... З кім і навошта?

Любоў ЛУНЁВА.

Цэны на лекі не ўтрымаліся

Імпартныя лекі чакае моцнае падаражанне. Нацбанк Беларусі прыняў рашэнне з 10 кастрычніка спыніць продаж валюты па нізкім курсе па артыкуле "для аплаты лекавых сродкаў, вырабаў медыцынскага прызначэння".

Такім чынам, разлікі коштаў зараз будуць весціся не з разліку 5000 беларускіх рублёў за долар, а з разліку 8—9 тысяч. Такім чынам, імпартныя лекі могуць падаражэць ледзь не ў два разы.

Варта адзначыць, што Нацбанк, уводзячы забарону на куплю валюты на медыкаменты, у сваім лісце спасылаецца на "сакрэтную" пастанову праўлення №435 з грыфам "ДСП" ад 7 кастрычніка 2011 года з назвай "Аб разліку лімітаў на куплю замежнай валюты". Раней афіцыйныя асобы ўсяляк абвяргалі, што існуюць нейкія ліміты і нейкае штучнае рэгуляванне валютнага рынку.

З лістапада набыць валюту можна будзе толькі па пашпарце

Такое рашэнне ўтрымліваецца ва ўказе прэзідэнта "Аб некаторых пытаннях ажыццяўлення валютна-абменных аперацый фізічнымі асобамі".

Дакументам уводзіцца рэгістрацыя пашпартных даных асоб, якія набываюць замежную валюту (як наяўную, так і безнаяўную, плацежныя дакументы ў замежнай валюце, у тым ліку дарожныя чэкі) за беларускія рублі ў абменных пунктах і касах банкаў.

Пры аперацыях продажу замежнай валюты, здзейсненых з дапамогай банкаўскіх пластыкавых картак, асобу ўладальніка карткі таксама будуць "браць на ўлік" з дапамогай базы даных банка, які эміталаў картку.

Незалежныя эксперты лічаць, што такая мера паспрыяе толькі таму, што зноў ажыве "чорны" валютны рынак.

Хто атрымае яшчэ і «сталічныя» 500 тысяч ?

Мінчан чакаюць чарговыя 500 тысяч рублёў грашовай дапамогі. Услед за рэспубліканскімі выплатамі праз тыдзень-два могуць пачацца і мясцовыя. Мінгарвыканкам ужо прыняў рашэнне выплаціць гэтыя грошы з бюджэту горада і зараз яно праходзіць экспертызу ў Мінюсце.

Спіс атрымальнікаў "мінскіх" грошай скарочаны, бо ў яго не трапілі бюджэтнікі. Пакуль плануецца, што 500 тысяч рублёў атрымаюць непрацуючыя пенсіянеры, а таксама непрацуючыя інваліды I і II групп, але толькі ў выпадку, калі і ў першых, і другіх пенсія меншая за 663.550 рублёў. На дапамогу могуць разлічваць таксама ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, дзеці-інваліды і дзеці, якія атрымліваюць пенсію праз страту кармільца.

Мяркуецца, што грошы можна будзе забіраць праз тыдзень-два.

Галоўнаму рэдактару "Народнай Волі" І.П.Сярэдзічу

Шаноўны Іосіф Паўлавіч!
Дазвольце праз Вашу газету выказаць шчырую падзяку ўсім, хто павіншаваў мяне з 80-годдзем.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

НУ І НУ!

...Маглі і ў калодзеж уляцець

За Віктарам Дашкевічам, адным са стваральнікаў партыі "Беларуская Хрысціянская дэмакратыя", мясцовыя міліцыянты палюючь увесь час. На мінулым тыдні яны, можна сказаць, кругласутачна сядзелі ў яго "на хвасце".

І ўсё ж у суботу Віктару ўдалося адарвацца ад пільнага вока тутэйшага ўчасковага Сяргея Мароцкага. Калі капітан міліцыі даведаўся, што апазіцыянера няма дома, імгненна кінуўся на пошукі. І не адзін, а разам з лейтэнантам дарожна-патрульнай службы Віктарам Борысам і нейкім чалавекам у цывільным. Так спяшаліся перахапіць дзе-небудзь Дашкевіча, што, разварочваючыся, урэзаліся ў яго калодзеж. Сіла ўдару была такой, што бетоннае кальцо лопнула. Яшчэ б крыху, і машына з міліцыянтамі магла б аказацца ў калодзежы.

Сёння Віктар Дашкевіч намераны звярнуцца ў пракуратуру з тым, каб вінаватыя ў нанясенні шкоды кампенсавалі затраты на рамонт калодзежа і панеслі адпаведнае пакаранне па службовай лініі.

Сцяпан КУХАРСКІ.

Капыльскі раён.

НАДВОР'Е

Мокры снег

У бліжэйшыя суткі, 11 кастрычніка, у цэлым па Беларусі будзе воблачнае з праясненнямі надвор'е. Ноччу часам чакаюцца дажджы. Удзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Мінімальная тэмпература паветра ў начны час не перавысіць плюс 3—9 градусаў. Максімальная ўдзень складзе 9—14 градусаў цяпла.

Па прагнозах сіноптыкаў, пачынаючы з серады з кожным днём будзе станавіцца ўсё халадней. Паўднёва-заходні вецер паступова зменіцца паўночным і ў канцы рабочага тыдня чакаецца прыход у Беларусь арктычнага паветра з акватораў паўночных мораў. Сярэднесутачная тэмпература паветра пачне павольна набліжацца да нулявой адзнакі.

На выхадных рост атмасфернага ціску ўзмоцніць уплыў на надвор'е халоднага антыцыклону. Узнікшы каля берагоў Грэнландыі, гэты антыцыклон пачне перамяшчацца на поўдзень і ў нядзелю яго цэнтр чакаецца над суседняй Польшчай. Паступова сціхне вецер, зменшыцца воблачнасць.

У суботу будзе пераважна без ападкаў. Толькі ва ўсходніх раёнах Беларусі месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі — мокры снег з дажджом. Тэмпература паветра ў начны час будзе вагацца ад мінус 3 градусаў да плюс 3 градусаў.

У нядзелю, 16 кастрычніка, будзе без ападкаў. Ноччу і раніцай згусціцца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 4 — плюс 3 градусы. На тарфяніках Палесся чакаецца 5—8 градусаў марозу. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад плюс 4 градусаў на паўночным усходзе краіны да 11—13 градусаў на захадзе Гродзенскай і Брэсцкай абласцей.

Такі тэмпературны фон, дарэчы, на 3—5 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
11 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Валянцін СТЭФАНОВІЧ:

«Відаць, уладам надакучыла актыўнасць беларускіх праваабаронцаў...»

Аб правах чалавека ў Беларусі, замежных рахунках і гучнай "справе Бяляцкага" карэспандэнт "Народнай Волі" гутарыць з вядомым беларускім праваабаронцам ***Валянцінам СТЭФАНОВІЧАМ.***

— Валянцін, давайце пачнём з таго, як вы прыйшлі да праваабарончай дзейнасці?

— У праваабарончым цэнтры "Вясна", які некалькі гадоў таму зачынілі, я стаў працаваць з верасня 98-га. Але цікавіцца грамадска-палітычным жыццём пачаў у 1994 годзе, калі прымаў удзел у прэзідэнцкай выбарчай кампаніі і на той момант агітаваў за лідара Партыі БНФ Зянона Пазьняка, працаваў назіральнікам на тых прэзідэнцкіх выбарах. Тады я быў студэнтам, удзельнічаў ва ўсіх акцыях "Мінскай вясны", меў дачыненне да стварэння структур "Маладога фронту"... Усё гэта і сфарміравала ў будучым маю жыццёвую пазіцыю. У 1998 годзе я атрымаў дыплом, пэўны час працаваў юрыстам на Мінскім падшыпнікавым заводзе, а ў хуткім часе апынуўся ў "Вясне".

— Кажуць, што праваабаронца — гэта стан душы...

— Няма ўзаконенага тэрміну "праваабаронца", але ёсць Дэкларацыя, якая была прынята Генеральнай Асамблеяй ААН. Яна і вызначае крытэрыі, хто такі праваабаронца — гэта чалавек, які адзін альбо ў групе асоб займаецца абаронай правоў чалавека. А правы чалавека — гэта вельмі шырокае паняцце, якое не абмяжоўваецца толькі палітычнымі пераследамі.

— Вы скончылі юрыдычны факультэт Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных зносін, заснавальнікам якога была Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі?

— Так, але хачу адзначыць, што той юрыдычнай адукацыі, якую, прынамсі, даюць у нашых універсітэтах, абсалютна не дастаткова, каб працаваць у накірунку абароны правоў чалавека ў Беларусі. Гэта вельмі вялікі кавалак міжнародных норм, а іх у нас мала хто выкладае. Можа, таму ў нашых дзяржаўных органаў і такое стаўленне: для нас, маўляў, усё, што датычыцца міжнародных абавязацельстваў — нішто.

— А ці даводзілася вам сустракацца з аднакурснікамі, што называецца, па розныя бакі барыкад?

— Пасля заканчэння вучобы я мала з кім бачуся, але некалькі разоў такое было. Адзін з маіх аднакурснікаў — намеснік міністра юстыцыі Беларусі, у 2001 годзе сутыкаўся падчас ператрусаў у кампаніі "Незалежнае назіранне" з супрацоўнікам аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, які таксама вучыўся са мной. Не скажу, што ў мяне да іх нейкія варожыя адносіны, але, як кажуць, на брудэршафт не п'ём. Кожны застаецца пры сваім разуменні і стаўленні да сітуацыі.

— Ці цяжэй зараз працаваць праваабаронцам?

— Скажам так: раней было прасцей. Ва ўсякім разе за краты не адпраўлялі, хоць ва ўсе часы былі свае складанасці. Напрыклад, спачатку быў зарэгістраваны праваабарончы цэнтр "Вясна-96", але затым не перарэгістравалі. Гэта была першая ахвяра. Літаральна кожны год у нас былі чарговыя і пазачарговыя праверкі Міністэрства юстыцыі. У 2001 годзе, калі пачалі актыўны ўдзел у назіранні за выбарамі, нашы назіральнікі былі пазбаўлены акрэдытацыі за дзень да выбараў па рашэнні Цэнтрвыбаркама. Неаднаразова выносіліся папярэджанні, а ў 2003 годзе Вярхоўны суд і наогул ліквідаваў "Вясну", хоць за апошнія два гады ніякіх папярэджанняў нам не выносілася. Там было шмат прэтэнзій з боку Мінюста, пачынаючы з таго, што мы быццам бы подпісы падрабілі падчас рэгістрацыі і гэтак далей. Суд гэта не прыняў да ўвагі, але ліквідаваў за грубыя парушэнні заканадаўства, якія, маўляў, былі два гады таму. Натуральна, мы не пагадзіліся з такім рашэннем. Звярталіся ў Камітэт па правах чалавека ААН, які ў 2007 годзе прыняў рашэнне, што ліквідацыя "Вясны" — парушэнне артыкула 22 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, а дзесяць чалавек былі прызнаны ахвярамі парушэнняў правоў чалавека. Беларускаму ўраду было прадпісана перарэгістраваць арганізацыю на працягу 90 дзён, але, натуральна, нічога гэтага не адбылося. Мы тройчы рабілі спробы вярнуцца ў легальнае поле і тройчы нам адмаўлялі. Апошні раз дайшло да абсурду! У спісе заснавальнікаў з 70 чалавек у чатырох знайшлі быццам бы няправільна ўказаныя звесткі аб месцы працы. Напрыклад, адна жанчына напісала, што працуе ў сярэдняй школе, а трэба было — " у сярэдняй адукацыйнай школе". Другі напісаў — "кіраўнік гуртка", а трэба — "кіраўнік секцыі"...

— Такія "недахопы" можна выправіць за некалькі секунд...

— Мы таксама задавалі такое пытанне, але ў Міністэрстве юстыцыі нам адказалі, што адтэрміноўку не дадуць, бо гэта права рэгіструючага органа, а яны гэтага рабіць не хочуць. Адным словам, усім зразумела, што праваабарончы цэнтр проста не хацелі рэгістраваць. Вось і ўсё! З 2006 года сітуацыя яшчэ больш пагоршылася, калі была крыміналізавана дзейнасць незарэгістраваных арганізацый. З гэтага моманту мы фактычна кожны дзень знаходзіліся пад пагрозай крымінальнага пераследу, хоць нікуды і не хаваліся. І публічна заявілі, што будзем працягваць праваабарончую дзейнасць, бо ў адпаведнасці з Дэкларацыяй аб праваабаронцах маем права займацца гэтым у групе асоб і шукаць фінансаванне для работы. І калі дзяржава абмяжоўвае нашы правы, дык тут больш пытанняў да дзяржавы. У нашай Канстытуцыі запісана, што не дазваляецца дзейнасць арганізацый, якія прапагандуюць гвалт, вайну, расавую і рэлігійную варожасць. "Вясна" гэтым не займалася. І тое, што сёння Алесь Бяляцкі аказаўся за кратамі, — вынік планамернай палітыкі ўлады ў дачыненні да няўрадавых арганізацый: выпіхванне з легальнага поля, абмежаванне на заканадаўчым узроўні магчымасці знешняга і ўнутранага фінансавання.

— Такім чынам, грошы, якія знайшлі на вашым і Алеся Бяляцкага рахунках, былі не асабістымі?

— Натуральна! Ёсць узаемадносіны паміж намі і фондамі. Апошнія пералічвалі грошы на рахункі, а мы трымалі справаздачу перад імі, на якія патрэбы фінансы патрачаны. З гэтага боку да нас ад фондаў ніякіх прэтэнзій не было і няма. І гэта не мае даходы і не асабістыя даходы Бяляцкага, як гэта хочуць прадставіць. Гэта пераслед праваабаронцаў, якія займаліся сваёй звычайнай дзейнасцю. Трэба называць рэчы сваімі імёнамі.

— Аднак юрыдычна да справы не падкапаешся. Ёсць замежныя рахункі, не плаціліся падаткі, а значыцца, было парушана беларускае заканадаўства...

— Паўтаруся, на рахунках былі не асабістыя сродкі Бяляцкага, гэтыя грошы па распараджэнні фондаў прадастаўляліся трэцім асобам (у тым ліку і ахвярам палітычных рэпрэсій) менавіта як дапамога. Што датычыцца асабістага прыбытку, дык і я, і Бяляцкі былі зарэгістраваны ў падатковай інспекцыі. Я свой падатак рэгістраваў кожны год, выплачваў 12 працэнтаў у бюджэт. Але чаму я павінен плаціць падатак яшчэ і не са сваіх грошай? Цікава, ці плаціла польская "Салідарнасць" падаткі, калі змагалася з камуністычным рэжымам?

— Ці можна было пазбегнуць гэтай сітуацыі?

— Пытанне вельмі складанае. Як я казаў, у Беларусі атрымаць такую замежную дапамогу практычна немагчыма. Іншая справа, што сённяшняя сітуацыя патрабуе пэўных дыскусій з нагоды таго, якім павінна быць супрацоўніцтва краін Еўрасаюза ў плане прававой дапамогі з аўтарытарнымі рэжымамі. А ўвогуле, у мяне такое адчуванне, што беларускія ўлады, калі рабілі запыт аб рахунках, проста закінулі вуду "на авось", і ім пашэнціла, бо запыты былі абсалютна нематываваныя. Калі зыходзіць з тых дамоўленасцяў, на іх можна было і не адказваць, бо не было распісана ў межах якіх працэдур запытваецца інфармацыя. На нас жа не было заведзена аніякіх крымінальных спраў. Атрымалася, што не крымінальная справа ў Беларусі стала падставай для запыту ў Літву, а наадварот — інфармацыя з суседняй краіны паслужыла ўзбуджэнню крымінальнай справы. Сёння з гэтай нагоды шмат версій, але, як мне падаецца, — гэта вынік неналежнага ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў Літвы і Польшчы.

— А ўвогуле, як вы даведаліся, што рахункі знайшлі і чакаецца крымінальная справа?

— Напрыканцы чэрвеня гэтага года мне і Алесю Бяляцкаму патэлефанавалі з падатковай інспекцыі і выклікалі да сябе. На месцы паказалі пакет дакументаў, які ў іх быў. Пасля прагляду тых дакументаў, што былі ў Алеся, стала зразумела, што ёсць падставы для яго крымінальнага пераследу. Але на той момант ніякіх папер адносна крымінальнай справы не было. Я на крымінальную справу "не цягнуў", але было зразумела, што мяне чакае адміністрацыйны пераслед і спагнанне грошай. Тады ўсё гэта выглядала вельмі дзіўна. Зараз ужо вядома, што інфармацыя аб рахунках была перададзена беларускім уладам у сакавіку, запыт паступіў у лютым. Фармальна крымінальную справу маглі распачаць яшчэ вясной, але чамусьці гэта не было зроблена. Ды і Бяляцкага можна было не выклікаць у падатковую інспекцыю і не даводзіць да ведама. Распачалі справу — і ўсё. Алесь мне тады казаў: "Напэўна, гэта зроблена адмыслова, каб пад пагрозай пераследу я пакінуў краіну і папрасіў палітычны прытулак". І на самай справе — ужо пасля таго як гэта здарылася, у Бяляцкага была неабмежаваная магчымасць выезду за мяжу. Я не буду рабіць таямніцу з таго, што варыянт палітычнай эміграцыі паміж намі і на самай справе абмяркоўваўся. Казаў Алесю: "Можа, лепш застацца ў Вільнюсе і кіраваць адтуль?" Той проста адмёў такія варыянты, заявіўшы: "Я не буду рабіць палёгкі для ўлады. Няхай самі вырашаюць, што далей рабіць са мной". І 4 жніўня Алеся Бяляцкага затрымалі. Я якраз ехаў у Вільнюс, у дарозе даведаўся... Але, азіраючыся назад, магу сказаць, што сённяшняя сітуацыя — абсалютна не выпадковая. Як мне падаецца, 19 снежня — гэта быў той рубеж, пасля чаго пачалася асаблівая "цікавасць" беларускіх улад да праваабаронцаў. У нас адразу ж прайшлі ператрусы, канфіскавалі камп'ютары... З тых часоў на офіс сілавікі наведваліся разоў пяць. Напэўна, наша актыўнае назіранне за выбарамі і матэрыяльная падтрымка палітычных ахвяр вельмі раздражнялі ўлады. Думаю, калі б мы займаліся нейкімі акадэмічнымі рэчамі, то і не было б ніякіх арыштаў. Але настаў перыяд часу, калі ўладам надакучыла наша актыўнасць. І "глебу" для гэтага рыхтавалі даўно. А тут — такі падарунак ад літоўскага і польскага бакоў! Усе карты ў рукі! Справа дазваляе правесці работу як па знішчэнні аўтарытэту ўсяго праваабарончага руху ў Беларусі, так і прадэманстраваць Захаду, што гэта звычайны крымінал з нявыплатай падаткаў. Іншая справа, што ў Еўропе ўсё цудоўна разумеюць. Але ў нас пэўная колькасць людзей можа паверыць у тое, што пададуць дзяржаўныя СМІ.

— А дзяржаўныя СМІ пададуць, што беларускія праваабаронцы сядзяць на мяхах з доларамі, маюць свае рахункі, на якіх вялізныя сумы...

— Асабіста мяне гэта не турбуе, бо я ведаю шмат-шмат людзей, якім мы дапамаглі, і якія ведаюць, чым мы займаемся. І не хаваю, што прыкладалі намаганні па пошуку сродкаў, таму што пасля 19 снежня рэпрэсіі насілі масавы характар, як вы ведаеце, адразу былі кінуты за краты больш за 700 чалавек. Дарэчы, шукаем не толькі знешняе фінансаванне, але і ўнутранае. Гэта было не наша рашэнне, каб пасля летніх маўклівых акцый людзі пачалі праз інтэрнэт збіраць грошы. Але ж збіралі, прыносілі, каб мы перадалі пацярпелым... Для мяне гэта падкрэслівае найвышэйшы аўтарытэт арганізацыі. Што датычыцца мяне асабіста, то акрамя кватэры, у якой жыву, больш нічога не маю, калі нехта думае, што я купаюся ў золаце. Ды і нашы ўлады вельмі добра ведаюць, на што ішлі грошы праваабаронцаў.

— Пасля таго, як арыштавалі Алеся Бяляцкага, вы каля двух месяцаў знаходзіліся ў Літве. Не было жадання папрасіць палітычнага прытулку?

— Адразу хачу сказаць, што я знаходзіўся ў Літве даволі працяглы час, таму што сумесна з Міжнароднай федэрацыяй правоў чалавека мы праводзілі працу па гэтай справе. Хоць, буду шчырым, прапановы аб палітычным прытулку мне паступалі неаднаразова. Перш-наперш — ад літоўскага кіраўніцтва. Мне асабіста тэлефанаваў міністр замежных спраў Літвы, які казаў прыкладна так: нас вельмі непакоіць ваша бяспека ў Беларусі, магчыма, вам варта застацца тут... Але я вырашыў ехаць дахаты. Мы ўжо фактычна 15 гадоў працуем у такіх умовах, таму і гэтая справа не павінна была стаць нечаканасцю. Акрамя таго, лічу, што калі мы хочам, каб праваабаронцы мелі магчымасць нейкім чынам уплываць на сітуацыю, то ім патрэбна знаходзіцца ў роднай краіне, а не за мяжой.

— Якімі вам бачацца перспектывы ўсёй гэтай справы?

— Супраць мяне заведзена адміністрацыйная справа за нявыплату падаткаў, падатковая інспекцыя пастанавіла спагнаць 31 мільён 500 тысяч рублёў нібыта ўтоенага падатку, а таксама 6 мільёнаў рублёў пені. Будзе суд. Пра перспектывы ж справы Алеся Бяляцкага вельмі цяжка казаць, таму што сітуацыя зараз вельмі хутка мяняецца. Напрыклад, пасля 19 снежня, калі пачаліся жорсткія рэпрэсіі, калі б мне сказалі, што праз паўгода людзей пачнуць вызваляць, я б у гэта не паверыў. Але тэарэтычна можна было гэта прадбачыць, бо эканамічны крызіс вымушае ўлады шукаць падтрымкі ў Еўропе. Мы прыкладалі і прыкладаем максімум высілкаў, каб Алесь быў вызвалены таксама. Ён пацярпеў выключна за сваю пятнаццацігадовую дзейнасць. Справа ўжо перададзена ў суд, будзем спадзявацца, што працэс пройдзе ў адкрытым рэжыме. Але я ўпэўнены ў адным — невінаваты чалавек павінен быць на свабодзе.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

БЛІЦ

Ці прывядуць планы Пуціна да страты суверэнітэту Беларусі?

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін нядаўна выступіў з "праграмным артыкулам", які растыражавалі многія расійскія сродкі масавай інфармацыі.

У артыкуле Уладзімір Пуцін падзяліўся сваімі палітычнымі планамі — у марах расійскага прэм'ера, які, не выключана, на наступных прэзідэнцкіх выбарах у Расіі зноў будзе абраны кіраўніком дзяржавы, — фарміраванне Еўразійскага саюза.

Што азначаюць гэтыя амбіцыёзныя планы Уладзіміра Пуціна? Ці азначаюць яны страту Беларуссю суверэнітэту? З гэтымі пытаннямі "Народная Воля" звярнулася да беларускіх палітыкаў і палітычных экспертаў.

Раман ЯКАЎЛЕЎСКІ, палітычны аглядальнік:

«Суверэнітэт Беларусі будзе вельмі ўмоўным»

— Еўразійскія планы Пуціна, агучаныя ў артыкуле, не новыя. Іх культывуюць рознага роду публіцысты і мысліцелі ў Расіі і іншых краінах. Адны разважаюць аб еўрапейскім аспекце, а іншыя — аб азіяцкім аспекце ў еўрапейскай прасторы. Саму ідэю стварэння Еўразійскага саюза адным з першых на постсавецкай прасторы агучыў прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў яшчэ гадоў дзесяць таму...

Сыходзячы з планаў Пуціна, страта суверэнітэту Беларуссю — цалкам рэальная. Бо ўжо ў ствараемым Мытным саюзе, а па Пуціну — гэта адна з фаз будаўніцтва Еўразійскага саюза, яго ўдзельнікі — Беларусь і Казахстан — ужо аддалі частку свайго суверэнітэту. Аднак галоўная "фішка" пуцінскай інтэграцыі заключаецца ва ўвядзенні на тэрыторыі Еўразійскага саюза адзінай валюты — расійскага рубля з адзіным эмісійным цэнтрам у Цэнтрабанку Расіі. Вось тады суверэнітэт Беларусі і іншых краін, якія ўвойдуць у новае ўтварэнне, стане вельмі ўмоўным. Застануцца толькі дзяржаўныя сцягі і прэзідэнты краін з незразумелымі паўнамоцтвамі...

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

«Уваход Беларусі ў склад Расіі можа прывесці да партызанскай вайны...»

— Я разглядаю "праграмны артыкул" Уладзіміра Пуціна як яго перадвыбарную праграму. Партрэт Пуціна-палітыка яшчэ не завершаны. Акрамя кансалідацыі грамадства ўнутры Расіі яму неабходна стварыць вобраз "збіральніка земляў". Ідэя стварэння Еўразійскага саюза якраз на гэта і скіравана.

Аднак я не думаю, што гэты праект будзе рэалізоўвацца такім чынам, каб Беларусь і іншыя краіны постсавецкай прасторы цалкам згубілі свой суверэнітэт. Думаю, што ў Крамлі цудоўна ведаюць пра сапраўдныя настроі ў беларускім грамадстве. Нават па даных праўладнага сацыёлага Катлярова аб поўным уваходзе Беларусі ў склад Расіі мараць толькі 2% беларусаў.

Пэўная частка грамадства хоча мець добрыя зносіны з усходнім суседам, але лічыць пры гэтым, што Беларусь павінна заставацца незалежнай, яшчэ нехта хоча, каб Беларусь увайшла ў Еўрасаюз. Уваход Беларусі ў склад Расіі можа прывесці да "партызанскай вайны" — канчатковага расколу грамадства.

І я ўпэўнены, нават глыбокае эканамічнае паглынанне Расіяй Беларусі выкліча непаразуменне ў грамадстве. Ёсць у гэтым і яшчэ адзін аспект: дзеючы кіраўнік Беларусі не пойдзе на канчатковае "паглынанне" нашай краіны Расіяй. Ён, канечне, можа нешта абяцаць, але потым выкруціцца. Лукашэнка разумее: уваход Беларусі ў склад Расіі — ягоны палітычны фінал, а яму, безумоўна, хочацца застацца ў гісторыі прэзідэнтам...

Вадзім ГІГІН, палітолаг, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка»:

«Небяспекі для суверэнітэту Беларусі няма»

— Стварэнне Еўразійскага саюза — не ідэя Уладзіміра Пуціна. З ідэяй стварэння Еўразійскага саюза яшчэ пятнаццаць гадоў таму выступалі Аляксандр Лукашэнка і Нурсултан Назарбаеў. І вось да трэцяга прэзідэнцкага тэрміну Уладзіміра Пуціна Масква сфармулявала гэтую ідэю як сваю.

Ніякай пагрозы для суверэнітэту Беларусі ўтварэнне Еўразійскага саюза не нясе. Тыя, хто кажа, што задача Расіі ўвесці ў Беларусі расійскі рубель і паглынуць Беларусь, проста выступаюць супраць любой інтэграцыі. Пра "паглынанне" Расіяй Беларусі размова не ідзе. Расія не паглынула Беларусь у апошнія 1000 гадоў, чаму гэта павінна адбыцца зараз?..

Аляксей ЯНУКЕВІЧ, старшыня Партыі БНФ:

«Беларуская ўлада будзе бараніць свой уласны суверэнітэт»

— Абсалютна відавочна, што артыкул Уладзіміра Пуціна вызначыў вектары знешняй палітыкі Расіі на бліжэйшую перспектыву. Асабіста ў мяне няма сумненняў, што Пуцін будзе наступным прэзідэнтам Расіі. Перадвыбарныя тэзісы, выкладзеныя Пуціным, безумоўна, нясуць пагрозу для суверэнітэту Беларусі. Па сутнасці, Пуцін кажа, што Расія не забываецца на свае імперскія амбіцыі і ў поле сваёй палітычнай сілы будзе ўцягваць суседзяў. Гэта сігнал іншым.

У той жа час я глыбока перакананы ў тым, што стварэнне Еўразійскага саюза — гэта ўтопія. З многіх прычын. Адна з іх вось у чым: на глыбокую інтэграцыю з Расіяй ніколі не пойдзе дзеючая беларуская ўлада. Яна будзе супрацьстаяць планам Крамля, абараняючы не суверэнітэт Беларусі, а свой уласны суверэнітэт.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ

Раздарожжа

Маніфест Пуціна і цывілізацыйны выбар беларусаў

Кіраўнік Расіі шчыра апісаў свой план стварэння неаімперыі: Мытны саюз — Адзіная эканамічная прастора — Еўразійскі саюз. Канкрэтная інтэграцыя, з канкрэтным паглынаннем і відавочным вынікам. Гаворка ўжо не вядзецца ні пра архаічную Саюзную дзяржаву, ні пра адышоўшы ў гісторыю СССР.

Расія марыць зноў стаць Вялікаю. Але не праз годнае ўладкаванне жыцця свайго народа, які па-ранейшаму бедны ў багатай краіне. Не праз спыненне войнаў, карупцыі, бандытызму, ксенафобіі. А, як і раней, "збіраннем земляў" і будаваннем новага сусветнага цэнтра сілы.

Мы жылі і жывём стагоддзямі побач з імперыяй. Многім у Расіі гэтае слова прыемнае — падстава для гонару і шанец на надзею. У расіянаў ёсць права выбіраць свой лёс, права ганарыцца тым, што "затое нас усе баяцца". У нас іншая гісторыя, іншы менталітэт.

У выніку рэалізацыі крамлёўскага праекта "Еўразійскі саюз" кантроль Масквы над "сінявокай" можа ўсталявацца навечна — праз эканамічную анексію і праз наднацыянальнае кіраванне.

Мары нашых рамантычных суграмадзян пра будучую беларускую Швейцарыю пасля маніфеста Уладзіміра Пуціна выглядаюць зусім маларэальнымі.

Нарадзіліся і жывём мы на мяжы цывілізацый.

Да ўсяго мы апынуліся закладнікамі постсавецкага аўтарытарнага рэжыму Лукашэнкі. Ён не меў і не мае стратэгіі развіцця для краіны — толькі рэалізуе тактыку выжывання. Не дзеля нас — дзеля ўлады. І ён ніколі не быў гарантам нашай незалежнасці.

Балансаванне паміж Захадам і Усходам, шантажыраванне Бруселя і Масквы, запалохванне беларусаў, накручванне саміх сябе. Бясконцы пошук ворагаў. А вораг на самай справе — унутры нас, у нашым мысленні, посткаланіяльным і посттаталітарным. У нашым разуменні ці хутчэй неразуменні сённяшняга свету, асабістай і гістарычнай адказнасці. Беларусь цяпер — на геапалітычным раздарожжы. Мы будзем вымушаны ў бліжэйшы час рабіць цывілізацыйны выбар — еўрапейскі альбо еўраазіяцкі, дэмакратычны альбо аўтарытарны. Выбар давядзецца рабіць і грамадзянам, і ўладзе, і апазіцыі.

Еўразійскі саюз, "магутнае наднацыянальнае аб'яднанне, здольнае стаць адным з полюсаў сучаснага свету", дзе Беларусь — дадатак на дзвесце тысяч квадратных кіламетраў з безаблічным, але працавітым народам і з багаццем, дагледжаным ці створаным гэтым народам? Альбо існаванне ў Еўрасаюзе сярэдняй, самабытнай, дэмакратычнай і заможнай краінай на ўзор Чэхіі, Аўстрыі, Галандыі ці Бельгіі?

Гэтыя перспектывы падаюцца далёкімі, але наш лёс можа вырашыцца неўзабаве — усур'ёз і надоўга. Магчыма, і назаўжды.

ДАВЕДКА

Аляксандр Мілінкевіч. Старшыня руху "За Свабоду". Нарадзіўся ў 1947 годзе ў Гродне. Кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт. Намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама (1990—1996). Кандыдат у прэзідэнты ад аб'яднаных дэмакратычных сіл у 2006 годзе. Лаўрэат прэміі Еўрапейскага парламента імя Андрэя Сахарава "За свабоду думкі".

ПЕРЕПАЛКА

Больно ударило рейтингом

"Манаев — это выкормыш Запада. Живет он в Вильнюсе. Я помню его рейтинги. Манаевские исследования накануне президентских выборов давали крах президенту Беларуси. Четко была выстроена стратегия. Манаеву заплатили, он четко выстроил так называемые социологические исследования, где рейтинг Лукашенко снижается. У него было, что меньше половины населения меня поддерживает. Западу нужно было это. Манаеву заплатили, и он выстроил такую тенденцию. На самом деле, белорусского президента поддержали 79,9% официально. Реально — больше 80%", — заявил Александр Лукашенко 7 октября, отвечая на вопросы российских журналистов.

Доктор социологии Олег Манаев ответил главе государства через СМИ белорусские.

"Я бы назвал заявления Лукашенко обо мне и моих исследованиях неадекватной интерпретацией", — заявил основатель Независимого института социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ) Олег Манаев.

Напомним, что накануне выборов и после них исследования НИСЭПИ показывали, что выигрывает Лукашенко.

"Исследования показывали, что за него проголосовало 58%. Это на 20% меньше, чем официальные данные, но он выиграл", — говорит Манаев. Эти данные 21 января на первой полосе даже опубликовала газета "Советская Белоруссия".

А сейчас опрос дал другой результат, и зазвучали другие речи.

"Когда системе нужно, она использует независимые социологические исследования, когда нет — у них другое мнение о ней", — пояснил Олег Манаев.

Напомним, что, согласно данным последнего опроса, рейтинг Александра Лукашенко всего за девять месяцев обвалился с 53% до 20%, достигнув исторического минимума за все семнадцать лет его правления. И сразу Манаев стал плох...

"Если бы это было так, если бы меня не поддерживали 80%, то я сейчас бы вещи собрал. Я за это кресло не держался и не держусь. Ну как это так, чтобы за полгода с 80 упал до 20, у нас что тут, работу кто-то потерял? Или еще что-то случилось? Так что эти все исследования меня нисколько не напрягают", — заявил Александр Лукашенко. И в очередной раз пообещал собрать чемоданы, если его не поддержит народ. Правда, по странному стечению обстоятельств, "плохим" итогам от социологов он верить не хочет. Видно, очень уж паковать чемоданы не хочется.

Игорь МОРОЗОВ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
11 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.

ДИСКУССИЯ

Следственный комитет: «за» и «против»

В правоохранительных органах Беларуси идет напряженная, хотя и невидимая общественности, работа по формированию нового ведомства — Следственного комитета. Он должен объединить следователей, которые нынче состоят в штате прокуратуры, органов внутренних дел, Комитета государственной безопасности и Комитета государственного контроля. Цель предстоящей реорганизации — повысить качество предварительного следствия по уголовным делам и обеспечить независимость следователей от "постороннего" вмешательства. По указанию президента, Следственный комитет должен начать функционировать в полном объеме уже с 1 января 2012 года.

В этой связи предлагаю юристам и другим заинтересованным лицам подискутировать на тему, чего можно ожидать от нового ведомства? Может ли оно решить проблему раскрываемости тяжких и особо тяжких преступлений, защитить невиновных от уголовного преследования? Станет ли следствие наконец-то независимым и неподкупным?

История повторяется...

Вопрос о создании Следственного комитета поднимался еще в начале 90-х годов на волне демократических перемен. В Концепции судебно-правовой реформы, утвержденной Верховным Советом Республики Беларусь 23 апреля 1992 г., среди прочих ставилась задача образования нового ведомства, работники которого должны были заниматься расследованием наиболее опасных преступлений. При этом допускалась возможность расследования органами прокуратуры дел о преступлениях, совершенных работниками правоохранительных органов и судов.

Однако в то время идея создания Следственного комитета не получила реализации. Слишком сильным было влияние "силовых органов", от которых собирались забрать следственные аппараты (прокуратуры, МВД, КГБ). Проект закона "О следственном комитете Республики Беларусь", одним из разработчиков которого являлся автор, не удалось даже включить в повестку дня сессии Верховного Совета. После этого о Следственном комитете постарались поскорее забыть.

И вот история повторяется. Теперь эту идею лоббирует сам глава государства. Что изменилось? Почему властям предержащим понадобился отдельный Следственный комитет?

Главная причина очевидна: низкое качество следствия. Достоянием общественности становятся случаи получения признательных показаний под принуждением, факты фальсификации доказательств, лжесвидетельствования. В результате суды должны или "прикрывать" недостатки следствия, или выносить оправдательные приговоры. По данным официальной статистики, за первое полугодие 2011 г. число лиц, которых судам пришлось оправдать или прекратить дела при проверке в вышестоящих инстанциях, составило 151 человек. А перед этими "мучениками" надо извиниться, восстановить их в нарушенных правах, компенсировать расходы и даже моральный вред.

Еще одна причина, которая заставляет пойти на создание Следственного комитета, это необходимость обеспечения следователям хоть какой-то самостоятельности. Не секрет, что в рамках ведомств они являются обычными сотрудниками "в погонах", которые обязаны подчиняться начальству и работать для достижения высоких показателей. И если проводится следствие по "ведомственным" уголовным делам, то виновные должны быть установлены и привлечены к ответственности. Причем чем больше будет виновных, тем лучшими будут показатели. В свою очередь сотрудники получат награды и звания.

Так что побудительные причины для создания нового ведомства, казалось бы, весьма прозаичные: не допустить социального гнева со стороны тех, кто напрасно "парился на нарах", их родственников и друзей. Слишком уж тяжелыми бывают последствия следственных и судебных ошибок...

При этом можно учесть и опыт соседнего государства — России, где с 2007 года функционирует Следственный комитет. Первоначально он был образован при Прокуратуре, а с января 2011 года он стал самостоятельным ведомством, которое подчиняется непосредственно Президенту Российской Федерации. Следователи этого ведомства на основании президентского указа получили высокий статус (их специальные звания приравнены к классным чинам прокурорских работников) и, надо полагать, имеют хорошую зарплату.

При условии, что Следственный комитет в Беларуси будет создан в качестве органа при главе государства, желающих в нем поработать найдется немало.

Станет ли следствие лучше?

Да, можно ожидать, что после реорганизации предварительное следствие получит новое качество. Во-первых, в штат следственного комитета зачислят наиболее квалифицированных и энергичных работников. Во-вторых, для следователей создадут лучшие условия, чем в их нынешнем положении. По всей видимости, у каждого из них будет отдельный кабинет, свой помощник (он же секретарь). В их распоряжение будут предоставлены современные технические средства, возможно, криминалистические лаборатории. В-третьих, в помощь следователю при расследовании сложных дел будут выделяться оперативные работники от "силовых" органов. В-четвертых, следователь станет самостоятельной и влиятельной фигурой, призванной решать задачи по полному, законному и быстрому раскрытию преступлений. Его непосредственные начальники будут заинтересованы в оказании ему всяческой помощи, а не в его подмене. В-пятых, изменится отношение к следователям со стороны прокуроров, осуществляющих надзор над законностью предварительного следствия. Они будут в большей степени доверять следователям, на которых ляжет вся полнота ответственности за итоги расследования.

При этом надо отдавать отчет в том, сколько дополнительных средств из госбюджета придется затратить на "запуск" и функционирование нового органа власти с широким штатом сотрудников на республиканском, областном, районном (городском) уровнях. Ведь их надо еще обеспечить помещениями, транспортом, техникой и всем необходимым для нормальной деятельности.

Нельзя сбрасывать со счетов и возможные негативные моменты, которые повлечет за собой создание Следственного комитета. Во-первых, следствие лишится своей привычной основы — оперативной составляющей в лице ведомственных оперативно-розыскных служб, которые нередко раскрывали преступление еще до возбуждения уголовного дела. В условиях Следственного комитета устанавливать контакт с "оперативными" будет сложнее: только в рамках уголовного дела.

Во-вторых, следователю чаще всего придется в одиночку раскрывать преступления, действуя методом индукции: от отдельных обстоятельств к выстраиванию всей картины преступления. Таким же методом придется вычислять и возможных преступников. Добывать признательные показания от подозреваемых лиц путем мордобоя или с помощью "пресс-хаты" для следователя будет зазорно. А кто же захочет просто так давать признательные показания?

В-третьих, нельзя исключить постороннего воздействия на "одиноких" следователей. Всегда найдутся желающие "решить вопрос". Значит, сами следователи будут находиться "под прицелом" спецслужб и в ряде случаев становиться жертвами их провокационных действий.

В-четвертых, после передачи "следаков" в новый орган именно к ним будут обращаться оперативные работники при реализации данных оперативно-розыскных действий, рассчитывая на их "понимание".

В-пятых, следователи останутся в определенной зависимости от прокуроров, которые кроме надзора за законностью предварительного следствия будут давать санкции на заключение подозреваемых и обвиняемых под стражу, на прослушивание телефонных переговоров, на производство обысков и иных действий в случаях, предусмотренных уголовно-процессуальным законодательством.

Понятно, что указанные "минусы" не могут перекрыть очевидных преимуществ создания единого следственного органа. Правда, суть проблемы не только в том, чтобы улучшить предварительное следствие...

Стоит ли менять колесо у старой машины?

Вместо судебно-правовой реформы, затрагивающей все звенья правоохранительных органов и судов, власти решили провести "ремонт" лишь одного звена — следственного аппарата. Однако его чистка и перестройка (даже под оком главы государства) не может изменить качество других звеньев — органов внутренних дел, прокуратуры, адвокатуры, суда.

Какой смысл пересаживать "милицейского" следователя в новое кресло в Следственном комитете, если остается его зависимость от нового начальника, а также от прокурора?

Уже сейчас очевидно, что Следственный комитет будет расследовать только часть уголовных дел (например, тяжкие и особо тяжкие преступления, преступления с участием несовершеннолетних). Основная же масса уголовных дел будет по-прежнему расследоваться так называемыми органами дознания — милиции, таможни, командирами воинских частей и др. По этим делам предусмотрены минимальные гарантии защиты прав обвиняемых как при проведении предварительного расследования, так и в судебном разбирательстве.

Остается нетронутой судебная система и порядок судопроизводства. Не ставится вопрос о введении суда присяжных заседателей по отдельным категориям дел. Не решается вопрос об отмене смертной казни, хотя этот вопрос можно решить одним росчерком пера. При таких условиях создание Следственного комитета может стать лишь видимостью реформ и показной заботой о правах человека.

На наш взгляд, проблему надо решать комплексно, в рамках судебно-правовой реформы. И начинать ее надо с главного органа правоохраны — суда. Его надо сделать независимым от всех, в том числе и от главы государства. Для этого следует вернуться к демократическому порядку формирования судов, который действовал по Конституции 1994 года: судьи высших судов — Конституционного суда, Верховного суда, Высшего Хозяйственного суда — избираются парламентом, а все остальные судьи — назначаются президентом по представлению органов судебного самоуправления.

Суды не должны также зависеть от местных органов власти. Этой цели будет служить принцип построения судов по округам, не совпадающим с границами административно-территориальных единиц: районов, городов, областей. Для эффективной защиты прав обвиняемых не прокуроры, а суды должны давать санкции на арест, а также другие процессуальные действия, связанные с вторжением в сферу конституционных прав и свобод.

Органы следствия, прокуратуры, как и адвокатские организации, — это вспомогательные органы (организации), содействующие суду в выполнении его задач. Они лишь готовят материалы для рассмотрения дел в судах. При этом не столь важно, в каких формах они будут действовать. Но от их деятельности зависит качество правосудия. Поэтому и следствие, и адвокатура в одинаковой степени должны быть самостоятельными и независимыми.

В нашем же случае власти собираются починить только одну опору, на которой стоит правосудие, а именно предварительное следствие, оставив без внимания другую опору, т.е. адвокатуру. Это — неправильный подход.

Для адвокатов надо создать не худшие условия, чем для следователей. И начать следует с предоставления им подходящих помещений. Далее их надо освободить от "опеки" органов юстиции, разрешить деятельность частных адвокатских фирм. Кроме того, адвокаты должны иметь право проводить в рамках уголовного дела самостоятельное расследование обстоятельств дела и направлять свои материалы в суд, как и следователи. А еще лучше не "загружать" суд томами уголовного дела, а представить свою позицию в открытом судебном процессе.

Тем самым интересы защиты прав личности в уголовном процессе требуют одинаковой заботы как о следователях, так и об адвокатах. И главное — надо обеспечить независимость судов. Без этого все потуги в плане реформирования органов предварительного следствия не дадут заметных результатов.

Михаил ПАСТУХОВ,
доктор юридических наук, профессор, один из разработчиков Концепции судебно-правовой реформы, а также законопроекта "О Следственном комитете Республики Беларусь".

Тамара Сідарэнка дабіваецца аднаўлення адвакацкай ліцэнзіі

Былы адвакат кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева Тамара Сідарэнка дабіваецца ўзнаўлення ў шэрагах адвакатаў. Яна звярнулася ў суд Маскоўскага раёна са скаргай на пастанову Міністэрства юстыцыі аб спыненні дзеяння яе ліцэнзіі.

У скарзе Тамара Сідарэнка звяртае ўвагу на юрыдычныя аспекты незаконнасці гэтай пастановы. Па яе словах, калі адвакат атрымае два прадпісанні Мінюста аб парушэннях, зробленых на працягу года, то ліцэнзія можа быць спынена ўжо пасля другога прадпісання. Фармальна ёй было вынесена два прадпісанні. Першае — за інтэрв'ю ад 24 снежня 2010 года з расказам пра тое, што яе не дапускаюць у следчы ізалятар КДБ да падабароннага Уладзіміра Някляева.

— Затым сталі ўсё правяраць, правяралі і мяне, і іншых. У выніку знайшлі парушэнні ў запаўненні пагаднення. Гэта такія тэхнічныя, на мой погляд, рэчы. Гэтыя парушэнні былі да снежня 2010 года. І па гэтых парушэннях прадпісанне было другое. Але я ж здзейсніла (калі здзейсніла) гэтыя парушэнні не пасля першага прадпісання, не пасля снежня 2010 года, а да снежня. Па законе атрымліваецца — у мяне няма другога парушэння пасля прадпісання.

Тамара Сідарэнка сказала, што на працягу 20 дзён павінны быць вызначаны тэрмін разгляду справы і суддзя, які будзе яе разглядаць.

Сідарэнка лічыць, што мае шанцы на поспех у судзе. Асабліва пасля адстаўкі міністра юстыцыі Віктара Галаванава.

ТЭНДЭНЦЫІ

Што за гаспадарка без каровы?

У Беларусі скарачаецца колькасць падсобных гаспадарак.

Пра гэта паведаміў начальнік аддзела ўкаранення новых форм гаспадарання галоўнага ўпраўлення эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір Красоўскі на пасяджэнні "круглага стала" ў Мінску.

Паводле яго слоў, толькі за мінулы год у параўнанні з 2009 годам колькасць асабістых падсобных гаспадарак паменшылася на 22 тысячы. Плошча сельскагаспадарчых угоддзяў скарацілася з 968 да 924 тысяч гектараў, удзельная іх вага ад агульнага аб'ёму землекарыстання знізілася з 11,1% да 10,6%. Штогод на 10—15% скарачаецца пагалоўе жывёлы ў асабістых падсобных угоддзях. За апошнія 15 гадоў колькасць кароў паменшылася больш чым у чатыры разы — з 742 тысяч у 1995-м да 168,5 тысячы ў 2010 годзе.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Павел СЕВЯРЫНЕЦ:
«Трэба рыхтавацца да горшага, і тады ўсё лепшае будзе ўспрымацца як сюрпрыз»

*Сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская Хрысціянская дэмакратыя» **Павел СЕВЯРЫНЕЦ** расказаў «Народнай Волі», як яму жывецца і працуецца на «хіміі», чаму фінансавы крызіс абышоў яго бокам і ці верыць ён у хуткае вызваленне.*

Нагадаем, што Павел Севярынец быў асуджаны за ўдзел у акцыі пратэсту 19 снежня на тры гады "хіміі". Адбывае пакаранне ён у спецкамендатуры №7 у вёсцы Куплін Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.

— Як жывецца? — усміхаецца суразмоўца. — Вось закончыў працоўны дзень, зараз сяджу ў альтанцы з кіраўнікамі выбарчых штабоў па Брэсцкай вобласці экс-кандыдатаў у прэзідэнты Мікалая Статкевіча, Дзмітрыя Усса і Віталя Рымашэўскага.

— Некалькі гадоў таму вы ўжо адбывалі пакаранне на "хіміі" ў вёсцы Малое Сітна, што ў Віцебскай вобласці. Ці моцнае адрозненне?

— Адрозніваецца. У Малым Сітне знаходзіўся філіял, і там было забаронена выходзіць за межы вёскі. А тут нельга выходзіць за межы камендатуры, таму ў гэтым плане абмежаванняў больш. Але, з іншага боку, на Віцебшчыне назіраўся ўсеагульны алкагалізм, а Куплін усё-такі — Заходняя Беларусь. Тут больш веры, больш беларускасці, больш імкнення ў людзей да лепшага жыцця.

— Да працы прызвычаіліся?

— Так, працую ў гаспадарцы "Бардо", у мае абавязкі ўваходзіць улік і выдача аўтазапчастак. Стараюся асвоіць.

— Складана?

— Інжынерная адукацыя ў мяне ёсць, хоць машыны сваёй і не было. Таму даводзіцца нейкім чынам прыстасоўвацца. Зрэшты, складаней за ўсё не гэта, а тое, што ты знаходзішся ў стане абмежаванай волі і не можаш дапамагчы тым людзям, якія разлічваюць на тваю дапамогу.

— Ведаю, што кіраўнік гаспадаркі хваліць вас як работніка.

— Паліткарэктнае кіраўніцтва. *(Смяецца.)*

— З мясцовым насельніцтвам ужо пазнаёміліся?

— Безумоўна. Пры гэтым вельмі шмат людзей прыязджаюць да мяне з навакольных вёсак, мястэчак, з саміх Пружанаў і Брэстчыны. Вельмі багата народу, наведваюць літаральна штодня! І не толькі наведваюць, але і шмат прывозяць з сабой прадуктаў, большую частку якіх, каб не папсаваліся, даводзіцца проста раздаваць. Нясуць нават тое, чаго ні разу ў жыцці не каштаваў. Так што фінансавы крызіс абышоў мяне бокам.

— А адкуль пра вас даведваюцца?

— Хтосьці праз газеты, нехта праз інтэрнэт... Скажу вам, што ў адрозненне ад Малога Сітна эпоха інтэрнэта прыйшла ў беларускую глыбінку, і тут без гэтага некаторыя проста не могуць уявіць і грамадскае жыццё, і інфармацыю наогул.

— Чым займаецеся ў вольны час?

— Пішу, сустракаюся з людзьмі, чытаю Біблію... Вольны час у мяне з 17.00 да 22.00, але, шчыра скажу, яго не хапае. Вось нядаўна мне прывезлі цэлую бібліятэчку кніг.

— Мікалай Статкевіч, калі апошні раз быў на "хіміі", актыўна займаўся спортам...

— У мае заняткі спортам уваходзіць пад'ём цяжкіх запчастак. Калі разгрузіш іх на складзе, то пэўную фізічную нагрузку і так атрымліваеш. Ды і на перакладзіне час ад часу падцягваюся.

— Царкву ж таксама наведваеце?

— Кожную нядзелю бываю ў Спаса-Прэабражэнскім саборы ў Пружанах. Дарэчы, з адным святаром з гэтай царквы, айцом Сергіем, мы пазнаёміліся праз сацыяльныя сеткі ў інтэрнэце яшчэ да таго, як я быў асуджаны.

— Сочыце за тым, што адбываецца ў краіне?

— Так, праз інтэрнэт у мабільным тэлефоне. А вось ноўтбукамі карыстацца забаронена.

— Як паставіліся да таго, што многія палітзняволеныя ўжо аказаліся на свабодзе?

— Тое, што людзі выходзяць на волю, — добра. Хоць мне цяжка меркаваць, наколькі гэта завязана на гандаль з еўрапейцамі і абмен закладнікаў. Але падаецца, што беларускія ўлады пайшлі на такія вымушаныя крокі пад міжнародным ціскам.

— Верыце, што і самі выйдзеце на волю раней часу?

— Ведаеце, трэба заўсёды рыхтавацца да горшага, і тады ўсё лепшае будзе ўспрымацца як сюрпрыз.

Алесь СІВЫ.

ЧУЛІ?

Анархісты таксама прызнаны палітзняволенымі

Праваабаронцы прызналі Ігара Аліневіча, Мікалая Дзядка, Аляксандра Францкевіча палітычнымі зняволенымі дзеючага ў Беларусі рэжыму.

Да такой высновы праваабаронцы прыйшлі на падставе адмыслова праведзенага аналізу так званай "Справы анархістаў". Згодна з паведамленнем РПГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт", дадзенае рашэнне грунтуецца на падставе наступных высноў:

1.Папярэдняе следства па крымінальнай справе суправаджалася сур'ёзнымі працэсуальнымі парушэннямі, у тым ліку правоў асуджаных. Сярод іх: адвольныя затрыманні, парушэнне тэрмінаў і працэдур затрымання, якія ўстаноўлены Крымінальна-працэсуальным кодэксам Беларусі, парушэнне права на абарону, парушэнне прынцыпу прэзумпцыі невінаватасці і іншае. Затрыманне Ігара Аліневіча ў Маскве і яго дастаўка ў СІЗА КДБ у Мінску ажыццяўляліся з грубымі парушэннямі ўстаноўленых працэдур, у тым ліку працэдуры экстрадыцыі грамадзян з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі ў Беларусь.

Асуджаныя Аліневіч, Дзядок, Францкевіч падчас судовага працэсу заяўлялі аб тым, што ў дачыненні да іх падчас папярэдняга следства выкарыстоўваліся незаконныя дзеянні: псіхалагічны ціск і катаванні. Аб прымяненні да іх катаванняў заявілі ў судовым разглядзе і шэраг сведкаў, якія адмовіліся ад сваіх паказанняў, дадзеных на папярэднім следстве (К.Коўка, А.Жынгяроўскі, І.Багачак, А.Бугаёў, С.Слюсар). Дадзеныя абставіны ў ходзе папярэдняга следства і судовага разгляду з належнай паўнатой не правяраліся, і ім не дадзена праваая ацэнка, адзначаюць праваабаронцы.

2.У ходзе судовага працэсу парушаўся прынцып роўнасці бакоў па прадастаўленні доказаў. "Грубыя парушэнні правоў асуджаных даюць падставу сцвярджаць, што разгляд справы ў судзе не быў аб'ектыўным, поўным і ўсебаковым, а вынесены прысуд — неабгрунтаваны і незаконны. Прысуд, які быў вынесены пры такіх абставінах, павінен быць адменены, а справа — накіравана на новы разгляд", — заключылі незалежныя юрысты.

3.Змяшчэнне пад варту І.Аліневіча, М.Дзядка, А.Францкевіча, іх асуджэнне да доўгіх, неадэкватных тэрмінаў пазбаўлення волі, на думку праваабаронцаў, "відавочна звязана з палітычнымі матывамі ўлад".

4.РПГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт", эксперты праваабарончай супольнасці Беларусі па выяўленых аб'ектыўных крытэрыях лічаць Ігара Аліневіча, Мікалая Дзядка, Аляксандра Францкевіча палітычнымі зняволенымі дзеючага ў Беларусі рэжыму.

Нагадаем, што "справа анархістаў" узнікла пасля таго, як бутэлька з гаручай сумессю была закінута на тэрыторыю рсійскага пасольства ў Мінску і пашкодзіла машыну. Аліневіч быў асуджаны на 8 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, Дзядок — да 4,5 года, Францкевіч — да трох гадоў зняволення.

Грып не абыдзе. Рыхтуйцеся!

Эпідэмія грыпу ў Беларусі чакаецца толькі ў канцы студзеня — пачатку лютага. Пра гэта паведаміла галоўны эпідэміёлаг Міністэрства аховы здароўя **Іна Карабан.**

Паводле яе слоў, эпідэмія грыпу чакаецца сярэдняй ступені інтэнсіўнасці, будуць пераважаць вірусы А (сезонны вірус А (H1N1) і А (H3N2)) і В. У мінулым сезоне эпідэмія пачыналася з перавагі вірусаў В, у яе разгар пераважалі вірусы А, затым, пры зніжэнні інтэнсіўнасці, зноў адзначаўся грып В. Хутчэй за ўсё ў наступным годзе эпідэмія грыпу будзе гэткай жа.

Карабан заявіла, што аптымальныя тэрміны імунізацыі супраць грыпу — да снежня. Імунітэт пасля прышчэпкі захоўваецца максімум да 6—8 месяцаў.

Як паведаміла загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка Шымановіч, на сёння ў Беларусі вакцыянірываныя супраць грыпу ўжо 15% насельніцтва — 1 млн 400 тыс. чалавек. Завезены ў Беларусь аб'ём вакцыны дазваляе ахапіць прышчэпкамі каля 28% насельніцтва, аднак пастаўкі працягваюцца. Плануецца, што да заканчэння кампаніі па імунізацыі ад грыпу прышчэпяцца 30% насельніцтва.

Бясплатна імунізуюцца групы рызыкі. У іх ліку людзі з высокай рызыкай узнікнення ўскладненняў пасля перанесенага грыпу: з хранічнымі захворваннямі, пенсіянеры ва ўзросце больш за 65 гадоў, а таксама людзі з высокай рызыкай заражэння на грып: медыкі, дашкольнікі і школьнікі пачатковых класаў, дзеці і дарослыя, якія пастаянна знаходзяцца ў закрытых калектывах і інш. Усе жадаючыя таксама могуць прышчапіцца за кошт асабістых сродкаў. Атрымаць прышчэпку можна ў любой паліклініцы па месцы жыхарства, у любым медыцынскім цэнтры. Як зазначыла Вераніка Шымановіч, вакцынацыя супраць групу не абараняе супраць захворвання поўнасцю, а прадухіляе развіццё ўскладненняў. З усіх захварэўшых на грып падчас эпідэміі толькі 5% прышчэплены супраць яго.

Сьлед матылька. Освальд у Менску

Прэзэнтацыя новай кнігі Аляксандра Лукашука ў кнігарні "логвінаЎ" 13 кастрычніка 19:00

Фэст літаратурнага вуаерызму. Вітаюцца гальштукі-матылькі і іншыя легкадумныя апранахі. Госьці атрымаюць кнігу ў падарунак (хто пасьпее). Прылятайце ў «логвінаЎ»!

Урад загадаў «Беларусбанку» прыпыніць льготнае крэдытаванне дольшчыкаў

З 10 кастрычніка і як мінімум да канца года банк не будзе пералічваць сродкі на будаўніцтва дамоў, якія здаюцца ў эксплуатацыю ў 2012 годзе і пазней.

Урад Беларусі прыняў рашэнне ў аднабаковым рэжыме спыніць льготнае крэдытаванне на будаўніцтва дамоў, якія здаюцца ў эксплуатацыю ў 2012 годзе і пазней. Такі загад аддадзены "Беларусбанку". Гэта вынікае з пратакола пасяджэння Савета Міністраў, які трапіў у газету "Наша Ніва".

У п.4.1.2 гэтага дакумента адзначана:

"Да вызначэння аб'ёмаў фінансавання жыллёвага будаўніцтва на 2012 год: ААТ "Беларусбанк" прыпыніць... ільготнае крэдытаванне будаўніцтва жылля, увод якога прадугледжваецца ў 2012 і наступным гадах".

Іншымі словамі, беларусы, якім дзяржаўны банк, згодна з дамовай, павінен пералічваць грошы ў тры наступныя месяцы, не атрымаюць ні рубля. За гэты час іх кватэры істотна падаражэюць, але розніцу ў кошце давядзецца аплачваць сваімі сродкамі.

Справа ў тым, што кошт большасці кватэр індэксуецца штомесяц. Неаплачаная сума множыцца на індэкс будаўніча-мантажных прац, вызначаемы міністэрствамі эканомікі і архітэктуры і будаўніцтва. Напрыклад, калі банк быў павінен да канца будаўніцтва перавесці забудоўшчыку 100 мільёнаў рублёў, але не зрабіў гэтага, кватэра з 1 кастрычніка падаражэла ажно на 9,83 мільёна (міністэрскі індэкс склаў 109,83%). Прычым падобны пералік кошту кватэры адбудзецца і з 1 лістапада, і з 1 снежня, і з 1 студзеня.

Гэтыя грошы будзе вымушаны заплаціць будучы ўласнік кватэры са сваіх сродкаў.

У дамовах удзельнікаў долевага будаўніцтва ніколі не ўдакладняецца, адкуль будуць прыходзіць грошы, ці ад банкаў, ці ад саміх людзей. У той жа час пры парушэнні тэрмінаў аплаты на працягу некалькіх месяцаў забудоўшчык мае права разарваць дамову. На думку экспертаў, фактычна "Беларусбанк" стварае для забудоўшчыкаў юрыдычную магчымасць адмовіцца ад старых дольшчыкаў і заключыць новыя дамовы, ужо па павялічаных коштах. Згодна з дакументам, з 1 студзеня 2012 года выплаты павінны аднавіцца, але калі эканамічная сітуацыя ў краіне застанецца нявызначанай, магчыма далейшае "замарожванне" крэдытных выплат.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
11 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.

ЭХО

Чему «лояльные» научат?

Здравствуйте, уважаемые сотрудники газеты “Народная Воля”!

Пишу в ответ на статьи Елены Молочко “И невозможное возможно” от 16.09.2011 г. и Светланы Горбуновой “Перетасовочки...” от 23.09.2011 г. о беспорядках, творящихся в знаменитом Художественном училище им А.К.Глебова.

О “глебовке” мне известно давно. Читая статьи об известных скульпторах, художниках и находя, что они вышли из “глебовки”, я всегда гордилась тем, что Беларусь имеет такое замечательное училище, которое дало миру много известных имен. Не знаю причин, по которым три с половиной года во главе училища стоит человек, владеющий сухой профессией — математик, Александр Валерьянович Шанторович. Но правит он, как удельный князь. По моему мнению, руководить художественным училищем должен человек, имеющий художественное образование. И надо не только иметь образование, но и быть известным художником, скульптором, на которых Беларусь не бедная. За три года из “глебовки” ушло почти 30 человек, что составляет 70 процентов от состава педагогов. Можно догадаться, кто вместо них пришел. Обычно в синеокой Беларуси любят лояльных, чтобы было меньше хлопот. Но кого они выпустят из училища? В “глебовку” поступали дети не обычные, а наделенные художественным талантом. Они мечтали учиться у известных художников, скульпторов, а им преподнесли посредственность. И что детям сейчас делать? Беларусь — страна с низким уровнем жизни. “Глебовка” давала возможность получать хорошее образование дома. Куда им сейчас податься?

Думаю, что Министерство образования должно обратить внимание на неблагополучную обстановку в училище и постараться в короткий срок изменить ее, чтобы вернуть “глебовке” былую славу, а детям дать возможность получить специальности художника, скульптора, а не формовщика, который сейчас обучает скульптуре вместо уволенной Светланы Горбуновой. А математик А.В.Шанторович, видимо, должен заниматься своим делом — математикой. Каждому свое.

С уважением —

Л.Д.САРОМ.

Минск.

P.S. *Моя внучка нынче поступила в “глебовку” на скульптора. Сейчас в шоке: что делать? Оставаться в таком училище нет смысла. Отправить ее учиться за границу нам не на что.*

НЕ МОГУ МОЛЧАТЬ!

Кто мы в своей стране?

По всем городам нашей страны развешаны красочные плакаты с общим подтекстом: “Мы — это Беларусь”. Так и хочется с гордостью подумать: как же мы и каждый из нас нужны нашей родной стране! Но отходишь от этих рекламных плакатов, и эта лишь на короткое время промелькнувшая гордость тут же сменяется жгучей обидой на то, в какой позорной ситуации нам приходится сегодня жить... Поводов для таких размышлений хоть отбавляй. Даже молча пройтись по городу сегодня не безопасно. Такое помнится только во времена фашистской оккупации. В дни молчаливых акций весьма популярным видом транспорта стали вместительные автозаки. Вот ситуация: если средь бела дня на тебя кто-то нападает, даже защищаться опасно, вдруг это “раздетая милиция”.

А зайди, например, в любой магазин. Ходишь по нему, как турист по музею: смотреть-то смотришь, как успешно стремятся к лучшей жизни цены на все товары, но желания, точнее, возможностей купить что-то становится все меньше и меньше. Даже батон для пенсионеров стал роскошью. И тебе “услужливо предлагают” кусочек хлеба в 300 граммов, нарезанный тоненькими ломтиками на порции, как в военном, блокадном Ленинграде. А цена, извините, даже выше, чем всего несколько дней назад за целый батон. И молоко, один из главных сегодня продуктов для многих жителей Беларуси, упорно выползает за размеры кошельков. Об обещанных шкварках сегодня и вспоминать не хочется. В общем, жизнь становится с каждым днем все “счастливее и веселее”. Аплодисментами бы выразить восторг от наших “успехов” и нашей “счастливой жизни”! Но, увы, и это сейчас — непозволительная роскошь, можно загреметь в места не столь отдаленные.

А ведь страна наша не простая. Нет во всем мире другой страны, столь серьезно пострадавшей от чумы нашего века — атомной энергетики. Более двух третей того, чем “одарил” мир взорванный чернобыльский реактор, досталось нашей Беларуси и ее многострадальному народу. Казалось бы, из чисто человеческих соображений именно народ нашей страны заслужил особую заботу о себе. И не просто заботу, но и защиту от каких бы то ни было новых испытаний и бед. Но, увы, не везет нам и в этом. Не прошли еще старые беды и не пройдут еще многие сотни лет, а на наши головы уже валится новая беда. Трудно даже понять, как могла прийти в голову мысль “одарить” народ Беларуси, захлебывающийся от последствий беды чернобыльской, новой атомной станцией, теперь уже на своей территории. А ведь кто-то же додумался, пришла же кому-то в голову столь бредовая и смертельно опасная и для нашего народа, и для народов-соседей идея.

Все клятвы со стороны вышесидящих в том, что они только и делают, что денно и нощно заботятся о нашем благе, защищают нас от всяких бед, как-то не воспринимаются. Вспоминаются события, связанные с чернобыльской бедой. Свалилась она на наши головы. Надо бы спасать людей, защищать их от опаснейших последствий этой беды. Но, как обычно, о людях тогда просто забыли. Мол, живите, как жили, копайтесь в земле, гуляйте с детьми по лесу, и обязательно идите на демонстрацию. А у нас дела срочные: свои семьи мы уже в места безопасные отправили, теперь главная задача — спрятать концы в воду, то есть разместо мусор по углам, чтобы никто не догадался, что у нас случилось. Вот только скандинавы подвели нас: всему миру растрезвонили, что зараза радиоактивная ползет от нас. Пришлось кое в чем сознаваться. Но отступали очень постепенно, не спеша: куда спешить, свои уже далече, а остальные потерпят. И терпели аж пять лет, пока народ не взбунтовался, защиты и заботы требовать стал.

Потом выяснилось, что “добра чернобыльского” Беларуси досталось больше всех. Вот и пришлось первый в Союзе Закон о поддержке пострадавших граждан принимать в Беларуси, в феврале 1991 года. Украина и Россия уже пошли по проторенному пути. Сказать, что эти законы полностью обеспечивали компенсацию нанесенного Чернобылем ущерба, нельзя. Но все же это был большой шаг в защиту людей. А в Беларуси трудно даже сказать, какая часть населения пострадала от чернобыльской трагедии. Практически в той или иной степени пострадало все население страны. Всех нас Чернобыль сделал чернобыльцами.

Но, как говорится, “недолго музыка играла”. Новая власть начала свою благую деятельность с основательного подкопа под чернобыльский закон. И уже в 1995 году указом президента было временно приостановлено исполнение основных статей Закона о социальной защите граждан, пострадавших от чернобыльской катастрофы. Это же надо, указом фактически отменен закон, принятый высшей властью страны! Такое ни в одну нормальную Конституцию не влезет!

И что очень интересно, указ-то как именовался: “Об упорядочении некоторых льгот для отдельных категорий граждан”. Пусть уж останется на совести составителей указа то, что весь пострадавший от Чернобыля народ Беларуси отнесли к “отдельным категориям”. Но о каких же льготах чернобыльцев идет речь? Ведь льготы — это то, что даруется людям за занимаемое ими положение или за их заслуги (действительные или мнимые). А у людей, пострадавших не по своей вине, есть лишь нанесенный им ущерб: физический, моральный и материальный. Вот, например, в российском законе четко определяется “право граждан, подвергшихся воздействию радиации вследствие катастрофы на Чернобыльской АЭС, на возмещение вреда и меры социальной поддержки”. Ни о каких льготах и речь не идет, лишь о защите прав и интересов пострадавших людей. Следовательно, тот указ не должен иметь никакого отношения к пострадавшему населению Беларуси. Но им фактически уничтожено все то, чего удалось добиться людям в защите своих прав.

Сравнивая сегодня чернобыльские законы стран бывшего СССР, с ужасом обнаруживаешь, что самая пострадавшая от чернобыльской катастрофы страна — Беларусь практически не имеет закона, защищающего своих граждан от нанесенного им вреда и ущерба. От закона осталось лишь название, лицемерные уверения в защите людей и мелочи, ничего не значащие в жизни людей. Уж честнее было бы просто закрыть закон, а не делать вид, что он существует, зная, что он уже, можно сказать, убит.

В других же странах бывшего СССР законы не только живы, но еще и совершенствуются в пользу людей. В российском законе, например, вводится кроме обычной пенсии, еще и компенсация нанесенного человеку ущерба. Украина расширяет базу медицинского обслуживания пострадавшего населения. А у нас наоборот: все, что было создано после чернобыльской катастрофы, просто уничтожено — ликвидирован чернобыльский диспансер, отобрана клиника в Аксаковщине, больше не действует положение о ежегодном обследовании пострадавших. Вместо расширения и совершенствования медицинской базы строятся ледовые дворцы и другие подобные сооружения, которые никак нельзя отнести к объектам первой необходимости. Даже научный Центр радиационной медицины убран из Минска в Гомель. Да и назвать его сегодня научным очень трудно, так как его основные научные кадры так и остались в Минске.

А чернобыльские законы даже таких небольших стран, как страны Балтии, Азербайджан и Молдова, продолжают заботиться о своих пострадавших гражданах. И только Беларусь упорно идет “другим путем”: не к народу, а от народа...

Георгий ЛЕПИН,
участник ликвидации последствий аварии с 1986-го по 1992 год, профессор.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Канфіскацыя

Прэзідэнт запатрабаваў канфіскоўваць у прадпрымальнікаў усе звышпрыбыткі. Аднак жа ва ўмовах інфляцыі і дэвальвацыі звышпрыбыткі немагчымыя ўвогуле...

Цяжкая фермерская доля...
Хоць непагода на дварэ,
Ён заўсягды на лузе, ў полі,
Ён сее, бараную, поле,
Молоціць, косіць, жне, арэ.
Вось і Рыгор быў гэткі ўвішны,
На гонях праліваў ён пот.
Як вынік, меў “рубель” (не лішні!)
За намалот, караняплод.
А побач клячаю старою
Ледзь выжываў-капцеў калгас.
І сеяў позняю парою,
І ураджай збіраў не ў час.
І не сказаць, што ўсе — няўмекі,
Каб сеяць жыта ці авёс.
Але, так мовіць, тры калекі
Цягнулі гаспадарчы воз.
Старых забрала ўжо магіла,
І меў калгас расклад такі:
Не прасыхалі ад “чарніла”
Не толькі мужыкі — жанкі.
Быў новы трактар у Рыгора —
Купіў за леташні ячмень.
(Яшчэ й камбайн набудзе скора —
Не пакладзе рублі ў кішэнь).
Каб ураджай жа мець належны
З гектараў фермерскіх сваіх,
Ён вопыт вывучаў замежны
І шмат чытаў разумных кніг.
Калгас жа быў зусім нядбайны.
Стаялі там на мехдвары
Чатыры здохлікі-камбайны
І тры калекі-трактары.
Дый інвентар быў “аніякі”:
Ліпелі сеялкі крыху,
Плугі ж — лічы, што жалязякі,
Хоць ты бярыся за саху.
Дадаткам нейкі нехлямяжы
Быў у калгасе аграном.
(Прынамсі, люд вясковы кажа,
Што ён купіў сабе дыплом.)
Чыноўніку (таму, хто “зверку”)
Быў неўспадоб такі расклад.
Зрабіў ён у прыбытках зверку
І ў той жа дзень аддаў загад:
— Патрэбна заўтра ж, тэрмінова
Праверыць фермера як след.
Чаму ён гэткі прыбытковы?
Там штось нячыста, не сакрэт...
Не даць яму, буржую, ходу!
І што рэнтабельнасці звыш,
Канфіскаваць, аддаць народу,
Які пяе “Шумел камыш”.
І фермера ўзялі за шкіркі,
Забралі “лішнія” рублі.
Калгас свае залатаў “дзіркі” —
Яму ўсе грошы аддалі.
Таму было ў калгасе свята:
Яму, лічылася, капут,
Калгас жа выплаціў зарплаты,
Якіх не бачыў зроду люд.
І бравы трактарыст Гаўрыла,
І Маня, што глядзіць цялят,
Такі займелі склад “чарніла”,
Што і на год ім аж зашмат.
Рыгор жа — роспачны, адчайны,
І думкі змрочнымі былі:
Не купіць ён цяпер камбайна
За тыя “лішнія” рублі...

* * *

Якая ж просіцца выснова
Пры канфіскацыі такой?
Навошта плуг і трактар новы?
Ары, як той калгас, сахой.

З НАТУРЫ

«Няхай вам палякі паставяць кацельню, а потым, магчыма, вы зможаце купіць долары...»

Сустрэў днямі аднаго знаёмага фермера. Бачу: без настрою чалавек. Пытаюся: у чым справа?

— У чым, у чым? У тым, што магу будоўлю замарозіць, — тлумачыць вясковец. — Не за гарамі зіма, трэба кацельню запускаць, а купіць не магу...”

— Грошай няма?

— Беларускія рублі ёсць, але валюты няма.

— Дык купіце на біржы.

— Лёгка сказаць “купіце”, — мой суразмоўца прамовіў апошняе слова з націскам у голасе. — Не прадаюць.

— Як не прадаюць? Зараз жа можна купляць валюту свабодна.

— Гэта вы так думаеце. На практыцы зусім іншае.

— Што значыць іншае?

— А вось тое, што мы падрыхтавалі ўвесь пакет дакументаў, а нам — ад варот паварот. Маўляў, няхай вам спачатку польская фірма паставіць кацёл, а потым, магчыма, вашай гаспадарцы будзе прададзена валюта. А які ж дурань без аплаты аддасць прадукцыю амаль на сем тысяч долараў...

Пасля такіх слоў я зразумеў, чаму мой знаёмы фермер без настрою.

Максім РУЦКІ.

SOS!

Как чуть внука не потеряла...

Пишу вам, чтобы рассказать, как работает в Орше медицинская служба, как оказывают помощь больным людям.

Дело в том, что у меня заболел внук. Ему 16 лет, учится в 11-м классе. И вот у него разболелся живот. Мы пошли на прием к участковому педиатру, она посмотрела, пощупала и сказала, что надо глотать зонд, чтобы посмотреть желудок. Выписала направление на следующий день. Но внуку становилось все хуже, у него началась рвота.

Во вторник я вызвала “скорую”, так как боли в животе усилились, рвота не прекращалась. “Скорая” завезла его в больницу. Дежурный врач опять пощупал живот, измерил температуру (она была повышена) и сказал, что можно лечиться дома. Нам выписали антибиотик и отправили домой. Внук еле дошел до остановки автобуса. Улучшения не наступало, у ребенка уже не было сил.

Я опять вызываю “скорую”, его опять везут в больницу. Пришли еще два врача, но мальчика все равно долго не хотели принимать, ссылаясь на то, что его уже осматривали и при осмотре ничего не было выявлено. Я была вынуждена идти на конфликт, заявила, что домой в таком состоянии внука забирать не могу, просто заставила их, чтобы он полежал под наблюдением, чтобы уточнили диагноз и приняли решение, что делать.

Когда я утром приехала в больницу, выяснилось, что внуку уже сделана операция по удалению аппендицита. Если точнее, был поставлен диагноз “острый флегмонозный аппендицит”.

Я возмущена работой врачей. Неужели так трудно поставить диагноз по такому уж совсем не сложному заболеванию, как аппендицит? Или хотя бы взять больного под наблюдение, если есть сомнения в диагнозе. Ребенок дошел до истощения. И никто из врачей не извинился за то, что случилось, что еле не отправили ребенка на тот свет.

Отсюда у меня возникает вопрос: “Почему так плохо учат врачей?” Я думаю, что скорее всего потому, что большинство из них учатся за деньги. А раз за деньги — значит, такие знания, значит, в душе нет доброты, значит, врач работает не по призванию. Мне кажется, что в медицинские вузы нельзя принимать абитуриентов, которые учатся за деньги. Им лишь бы получить диплом о высшем образовании, остальное приложится.

А вспомните, как было раньше? Врач, жертвуя своим здоровьем, ехал на лошадях в кибитке в мороз и стужу далеко в деревню, чтобы оказать помощь больному человеку. Ими двигал долг врача, клятва Гиппократа. Теперь уже многие врачи забыли (конечно, не все) об этой клятве.

Или вот еще хочу рассказать случай, который произошел со мной. Пошла я к окулисту, чтобы проверить зрение и выписать очки. Доктор посмотрел в мою карточку и говорит: “Бабушка, вам уже умирать пора, а вы очки пришли выписывать”. “А мне всего 82 года и умирать мне рановато”, — сказала я яму. Я была в шоке! И этот человек называется врачом! Какая уж там клятва?! Пусть простят меня те врачи, которые честно выполняют свой долг. Дай Бог им счастья и здоровья на долгие годы! Но, думаю, и они не хотели бы оказаться на приеме у многих своих коллег.

С уважением —

бабушка Антонина Сергеевна ПАТРЕЙ.

г.Орша.

АСАБІСТЫ ВОПЫТ

Каму «прамая лінія», а каму крывая...

Сталічныя ўлады паведамілі, што 6 кастрычніка з 14 гадзін 30 мінут да паловы чацвёртай старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька будзе прымаць тэлефонныя званкі ад гараджан і адказваць на іх пытанні. Звяртацца можна было і на электронны адрас: vlast@sb.by.

Што з таго атрымалася, цяжка меркаваць, бо асабіста я датэлефанавацца так і не змог, хоць тарабаніў цэлую гадзіну. Магчыма, камусьці пашэнціла болей, але не думаю.

Па-першае, адна гадзіна для паўтарамільённага горада — гэта амаль нішто. Па-другое, адзін тэлефонны нумар, на які абрынулася армія мінчукоў, — таксама адчэпнае... Словам, хацелі, як лепш, а атрымалася — як заўсёды. Затое цяпер спадар Ладуцька і прыбліжаныя могуць паставіць тлустую птушачку ў графе “работа з масамі”. Пасля прэзідэнцкай прачуханкі мэра і ягонага апарата, якія працуюць крайне неэфектыўна, нездавальняюча, можна, як кажуць, перавесці дух. Прадчуваючы, што мой званок наўрад ці даляціць да вушэй гораданачальніка, зараней даслаў свае два кароценькія пытанні па электроннай пошце. Але не ўпэўнены, што атрымаю адказ па тэлефоне ці праз сеціва. Таму дасылаю іх праз газету. А раптам?..

Пытанне першае. Студэнтам адмянілі плату за праезд у грамадскім транспарце... А як будзе з пенсіянерамі? Ну, хаця б з непрацуючымі, хаця б на якія 50 працэнтаў уважылі тых, хто найгорай пачувае сябе ў няпросты час. Ці гэта ўжо “адпрацаваны матэрыял”, з якім і лічыцца не варта?.. Якія планы ў мэра на гэты конт?

Далей. Шаноўны Мікалай Аляксандравіч, вышэйшае кіраўніцтва дзяржавы прад’явіла Вам сур’ёзныя прэтэнзіі, роўна як і ўсяму мінгарвыканкамаўскаму апарату. Вы прамаўчалі (наколькі было відаць з экрана тэлевізара), не запярэчылі... Ці азначае гэта, што з прад’яўленымі прэтэнзіямі — да Вас і Вашых падначаленых — Вы цалкам згодны? Калі згодны, то што Вас трымае на пасадзе мэра? Калі не, то чаму прамаўчалі? Ці, можа, гэта суперновы прыём — такім макарам “трымаць начальніцкі ўдар”?

З павагаю —

Георгій ЧЫГІР,
жыхар горада Мінска.

ТЫМ ЧАСАМ

З вялікага грому малы дождж

Аляксандр Лукашэнка аб’явіў старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалаю Ладуцьку заўвагу за непрыняцце належных мер па арганізацыі працы з інвестарамі, цяганіну і бюракратызм.

Мэр Мінска атрымаў нават не вымову, а заўвагу, хаця перад тэлекамерамі Аляксандр Лукашэнка крытыкаваў Ладуцьку жорстка і нават з нейкім асаблівым энтузіязмам.

Нагадаем, што на нарадзе 29 верасня па рэалізацыі ў Мінску інвестыцыйных праектаў Лукашэнка раскрытыкаваў сталічныя ўлады за цяганіну і бюракратызм у працы з інвестарамі. Ён нават прызнаўся, што хацеў зачыніць Мінгарвыканкам і набраць новых людзей. Гучала грозна, а скончылася нічым.

ТАК ДУМАЮ!

Один ум хорошо, а воля народа лучше

“Ливийская война положила конец давнему представлению о суверенитете, при котором все преступления дозволены при условии, что они совершаются внутри границ одного государства. И эта же война породила идею всеобщности прав человека, являющуюся не просто благим пожеланием, но священной обязанностью”. Это я процитировал слова президента Франции Николя Саркози.

“Если человек думает, что может бесконечно руководить, то он опасен для общества”. А это уже Дмитрий Медведев.

Вот на эту тему и пришло время говорить лидерам стран ЕС. Пора всем странам признать всеобщность прав человека.

Старое представление о суверенитете увековечивает бесчеловечное правление неадекватного мышления, и если африканские диктаторы любым путем пытались удержать свою, веками наследованную монархическую власть, то у Лукашенко такого основания нет, он, по советской теории, был никем и стал всем. Вот и наша страна стала никакой. Но реалии таковы, что наш народ слишком раб, чтобы встать на защиту своих прав, оппозиция слишком малочисленна, чиновники и генералы слишком продажны. Невозможно перечислить все факты самодурства, но один пример приведу.

Путин говорит своим министрам: *“Мы должны в первую очередь делать то, чего ждет от нас народ”.* Лукашенко говорит: *“Что бы кто бы мне ни говорил, а я буду развивать спорт”.* Чувствуете разницу?

И всегда и все будет именно так, как он хочет, пока хоть одно препятствие и хоть один гектар земли останется в белорусской собственности. С этим надо что-то делать.

З.Р.СЕНЬКО.

г.Мозырь.

ПАСТФАКТУМ

І словам, і душою...

...Якраз 30 верасня, у дзень юбілею народнага паэта Ніла Гілевіча, выйшаў чарговы нумар рэспубліканскай газеты “ЛіМ” (“Літаратура і мастацтва”). Ні словам, ні паўсловам выданне нават не абмовілася, што акурат у гэты дзень 80 гадоў таму нарадзіўся наш славуты сучаснік — найвыдатны творца і адданы сын Беларусі. Прамаўчала на гэты конт, нібы вады ў рот набраўшы, і “Настаўніцкая газета” — пры ўсім пры тым, што прафесар Гілевіч ажно 30 год жыцця прысвяціў педагагічнай, выкладчыцкай працы...

Пра іншыя афіцыйныя дзяржаўныя выданні і казаць няма чаго, бо ім — сервільным, прыслужніцкім перад уладай — сапраўды няма чаго казаць: не хапіла духу павіншаваць чалавека, які ўвасабляе сабой годнасць, гонар і талент свайго народа, падзякаваць за нястомнае служэнне Радзіме і высокамастацкім словам, і напоўненай любоўю душой.

Затое мноства прыхільнікаў творчасці патрыярха беларускай паэзіі, волата Нацыянальнага Адраджэння ўспрынялі яго юбілей як асабістае свята. Магутная хваля віншавальных званкоў, тэлеграм, паштовак з розных куткоў Беларусі і з-за яе межаў абрынулася на юбіляра, а дзверы кватэры ледзь не штурмавалі людзі з кветкамі — знаёмыя і незнаёмыя, але блізкія, родныя па духу. Асабліва кранула, што сярод іх было шмат моладзі, якой да душы натхнёныя вершы старэйшага паэта краіны, вечна маладога ў сваіх светлых, высокіх патрыятычных пачуццях.

Гучалі яго вершы і ў перапоўненай вялізнай зале Чырвонага касцёла, дзе прайшла ўрачыстая імша ў гонар і за здароўе вялікага сына Беларусі. І там было мора цеплыні і сардэчнасці, скіраванай да слыннага сына Бацькаўшчыны. Вёў служэнне ксёндз-магістр касцёла Святых Сымона і Алены, шчыры прыхільнік беларушчыны Уладзіслаў Завальнюк. І хаця сам Ніл Сымонавіч з-за стану свайго здароўя не мог прысутнічаць на гэтай урачыстасці, але ён і на адлегласці адчуваў светлую энергію дабра ад добрых людзей, якім удзячны ўсім сэрцам.

Мноства лістоў з віншаваннямі юбіляру прыйшло і ў рэдакцыю “Народнай Волі”. Толькі частку з іх мы здолелі апублікаваць, частку друкуем сёння. Хай не крыўдуюць тыя, чые допісы не трапілі на старонкі газеты, — мы абавязкова перададзім іх Нілу Сымонавічу. Зычым яму, даўняму сябру нашай газеты, і вам, шаноўныя чытачы, і надалей справай і душой служыць сваёй Радзіме, набліжаць яе светлы дзень!

Рэдакцыя “Народнай Волі”.

Дажывём!

Не ведаю, хто яшчэ з такой непахіснасцю і сілай адстойвае родную мову — душу народа, бароніць Беларусь ад згубы, як Вы, дарагі Ніл Сымонавіч. Сваімі непараўнальнымі творамі Вы паказваеце ўсяму свету, якая багатая, прыгожая, спеўная, крынічная наша мова. І не даяце гэтай крыніцы, што бярэ выток у глыбіні стагоддзяў, абязводзіцца, заглухнуць. Сваім яркім талентам Вы адорваеце людзей надзеяй, што Беларусь уваскрэсне, а ўсё тлумнае, бязглуздае назаўсёды сыдзе ў нябыт. Зычу, шаноўны наш Паэт, дажыць да гэтай светлай пары. Ну і нам усім — таксама.

Пётр КОНАСАЎ,
жыхар пас.Цагельня Гомельскага раёна.

Мы верым Вам

Мне, былому партызану і франтавіку, да душы тыя літаратурныя творы, якія адкрываюць чытачам розных пакаленняў праўду аб страшным ліхалецці. Знаходжу гэтую праўду найперш у прозе Васіля Быкава і ў паэзіі Ніла Гілевіча, асабліва ў яго паэме “Паланез Агінскага”. Яна ўскалыхвае і апякае сэрца пранізлівым болем. Ды і іншыя творы народнага паэта немагчыма чытаць раўнадушна.

Хачу сказаць яму: дарагі Ніл Сымонавіч, Вы — мой паэт! “Наш!” — паправяць мяне сябры-ветэраны, разам з якімі мы стварылі ў Гродне музей Васіля Быкава і імкнёмся данесці да сённяшняй моладзі лепшыя здабыткі беларускай літаратуры. Усё робім для таго, каб як мага больш землякоў пачулі Ваш заклік-параду: *“Верце толькі тым і ідзіце толькі за тымі, для каго свабода і незалежнасць Бацькаўшчыны даражэй за ўсё на свеце!”*

Мы чуем Вас. Мы верым Вам. Ваша кніга публіцыстыкі “Толькі мы самі” — настольны падручнік для ўсіх, каму неабыякавая Радзіма.

Мікола МЕЛЬНІКАЎ,
удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Гродна.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
11 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.

КОРОТКО

Успешные бои за Сирт

Повстанцы продвинулись в сторону центральной площади, захватили университет, главную городскую больницу и удерживают контроль над комплексом зданий конференц-центра "Уагадугу", являющимся штабом верных Каддафи правительственных сил.

В Сирте еще остаются тысячи мирных граждан. Многие боятся репрессивных мер со стороны бойцов НПС. Говорит Абдулла Салим, покинувший Сирт вместе со своей семьей: "Тяжелые бои и бомбардировки продолжаются; это невыносимо. У нас один выход — бежать". Очевидцы говорят, что запасы продовольствия и воды в городе на исходе, электричества нет. Катастрофически не хватает лекарств.

Осада и штурм Сирта ведутся уже в течение трех недель. Каждый день полевые командиры обещают взять город под полный контроль, но пока этого не удается.

«Финансовый ответ» Франции и Германии

Президент Франции Николя Саркози и канцлер Германии Ангела Меркель провели в Берлине переговоры о выходе еврозоны из финансового кризиса. Главной темой по-прежнему остается ситуация в Греции, ее влияние на стабильность европейского банковского сектора и выработка единой позиции в преддверии предстоящего в начале ноября саммита Большой двадцатки.

Николя Саркози, президент Франции, говорит: "Этот финансовый кризис уже привел к многочисленным страданиям людей в моей стране и по всему миру. И мы должны дать ему достойный и всеобъемлющий ответ. И мы полны решимости сделать это до конца текущего месяца, еще до того, когда лидеры Большой двадцатки соберутся на свой саммит в Каннах".

Саркози и Меркель также заявили, что достигли согласия по поводу общих условий рекапитализации европейских банков, страдающих от кризиса. Кроме того, лидеры Франции и Германии сообщили прессе, что считают необходимым внести "важные изменения" в договорные документы Евросоюза с тем, чтобы "ускорить интеграцию стран зоны евро". Ангела Меркель вновь выразила уверенность, что усилия европейских политиков позволят Греции сохранить свое членство в еврозоне.

Более 20 человек стали жертвами массовых беспорядков в центре Каира

Египетские христиане-копты организовали в столице акцию протеста против уничтожения их церквей: одну из них, в районе Луксора, разрушили и сожгли несколько дней назад. Протесты начались у здания каирского телевидения; силы безопасности пытались помешать проведению акции, и она переросла в столкновения с полицией и прибывшими на место армейскими подразделениями.

Премьер-министр египетского правительства Исам Шараф назвал происходящее "заговором": "Наибольшая опасность для безопасности страны состоит в попытках стравить мусульман и христиан, сынов нашего дорогого Египта, и в попытках вбить клин между народом и армией. Это дает возможность нашим врагам расколоть нацию, именно в этом заключается их цель. Но мы не поддадимся на эти порочные провокации".

Акции протеста прошли также в каирском районе Шобра, населенном коптами; там отмечены столкновения между христианами и мусульманами — две стороны забросали друг друга камнями в районе коптской больницы. В Луксоре и Александрии состоялись марши протеста, завершившиеся без серьезных инцидентов.

Ответы по… экономике

Американцы Томас Сарджент и Кристофер Симс получили Нобелевскую премию по экономике 2011 года. В заявлении Шведской академии наук говорится, что премия присуждена им за эмпирические исследования о причинах и следствиях в макроэкономике.

Лауреаты премии "разработали методы по получению ответов на вопросы относительно причинно-следственной связи между экономической политикой и различными макроэкономическими переменными, такими как валовой внутренний продукт, инфляция, занятость и инвестиции", — говорится в заявлении.

СКАНДАЛЫ

Адвокаты диктатора бросили ему спасательный круг

Россия и Китай наложили вето на резолюцию Совета Безопасности ООН, в которой содержалось требование к сирийским властям немедленно прекратить атаки против мирного населения. Западные страны, предложившие проект резолюции несколько недель назад, а затем трижды менявшие ее положения в соответствии с российскими возражениями, возмущены такими действиями. Такой острой словесной перепалки между Западом и Россией и Китаем уже давно не было.

Они поставляют режиму оружие, из которого стреляют по невинным мужчинам, женщинам и детям

Постоянный представитель Соединенных Штатов в ООН **Сюзан Райс** заявила: *"Соединенные Штаты возмущены тем, что Совет Безопасности не нашел ответа на растущую угрозу региональной безопасности. Несколько членов Совета пытались ослабить резолюцию, где содержались меры, способные защитить гражданское население от насилия со стороны режима Асада. Но два члена наложили вето на выхолощенный текст, где даже не упомянуты санкции".*

Посол США предупредила оппонентов в Совете Безопасности: жители Ближнего Востока теперь могут ясно увидеть, какие страны отвергли их призыв к демократии и вместо этого решили поддержать жестоких диктаторов... Посол США бросила упрек России в том, что Москва действовала исходя из интересов своих военных экспортеров.

Еще более жесткое заявление сделала госсекретарь США **Хиллари Клинтон**. Она заявила, что Совет Безопасности ООН, отклонив резолюцию, не справился со своими прямыми обязанностями и что России и Китаю придется объяснить, почему они заблокировали принятие документа, сирийскому народу, а также всем, кто сражается за свободу и права человека по всему миру. *"Страны, продолжающие поставлять режиму Башара Асада оружие, из которого стреляют по невинным мужчинам, женщинам и даже детям, должны крепко задуматься о том, что они делают, — сказала Клинтон. — Эти страны заняли неверную сторону с точки зрения истории. В этом споре они защищают совсем не тех, кого следовало бы".* По словам госсекретаря, сирийский народ этого не забудет.

Глава немецкого МИД **Гидо Вестервелле** заявил, что Совбез не справился со своей ролью гаранта мира и безопасности на планете. По его словам, Германия продолжит призывать к тому, чтобы на сирийский режим оказывалось давление. Министр иностранных дел Великобритании **Уильям Хейг** назвал российско-китайское вето "глубоко ошибочным решением".

Израиль и Франция также резко отреагировали на итоги голосования в Совете Безопасности ООН. Они раскритиковали Россию и Китай за то, что те блокировали принятие документа, предусматривающего санкции против правительства Башара Асада, если оно не остановит насилие в стране в течение 30 дней. Представитель Израиля в ООН **Рон Просор** заявил, что применение в данном случае права вето является "пятном позора" на всем международном сообществе и на России в частности. *"Близорукость Совета Безопасности сравнима только с близорукостью офтальмолога Башара Асада, который убивает собственный народ день за днем. Продление диктаторского режима в Дамаске на совести тех, кто отходит в сторону в это критическое для сирийского народа время"*, — цитирует слова дипломата сайт телеканала Arutz Sheva.

"Это — грустный день для сирийского народа, а также для самого Совета Безопасности", — заявил глава МИД Франции **Ален Жюппе**. По его мнению, Совбез ООН *"не мог сохранять молчание перед лицом сирийской трагедии". "Он должен был восстать против диктатора, который уничтожает свой народ и пытается задушить законное устремление сирийцев к демократии"*, — сказал дипломат. В свою очередь, комментируя вето, наложенное накануне на проект резолюции СБ ООН по Сирии, постоянный представитель Франции при ООН **Жерар Аро** заявил, что никакие отклонения не помогут развязать руки Дамаску, который "уничтожает собственный народ". *"Призывы Лиги арабских государств прекратить кровопролитие, заявления соседних стран, страдания граждан Сирии свидетельствуют о том, что это вето противоречит развитию событий в Сирии и во всем регионе"*, — подчеркнул Аро.

Французское правительство склонно считать, что члены Совета Безопасности игнорируют страшные потери, которые день за днем несет население Сирии: более 2,7 тысячи погибших среди мирного населения, десятки тысяч арестованных демонстрантов, более 10 тысяч беженцев. Все это указывает на необходимость принятия санкций против Дамаска, — уверены в Париже. Франция приветствовала создание Национального совета Сирии, объединившего представителей различных течений местной оппозиции. *"Борьба сирийских демократов за свободу — это справедливая борьба. Франция будет и впредь решительно ее поддерживать вместе со всеми странами, которые этого пожелают"*, — заверил руководитель французского МИД.

Постоянный представитель России при ООН **Виталий Чуркин**, объясняя позицию Москвы, заявил, что итоги голосования по резолюции Совбеза в отношении Сирии продиктованы конфликтом политических подходов. *"Непринятый проект был построен на совершенно иной философии. Философии конфронтации. Не можем согласиться с его односторонним обвинительным уклоном в адрес Дамаска"*, — сказал Чуркин. По словам российского представителя в ООН Виталия Чуркина, Москва опасается, что резолюция в будущем может быть использована в качестве предлога для силовых акций.

Что они говорят арабскому миру

Резолюция представляет собой односторонний документ. В ней упоминаются нарушения прав человека со стороны властей и упускаются подобные акции противной стороны. Достаточно посмотреть на последний абзац резолюции, где говорится о том, что Совет Безопасности через тридцать дней рассмотрит выполнение Сирией этой резолюции. Но почему мы не говорим об экстремистах, о тех, кто прибегает к террористическим атакам в Сирии? — сказал Чуркин.

На вопрос журналистки арабской газеты, что он скажет арабскому миру, в глазах которого Россия защищает диктаторский режим, посол России в ООН ответил, что Москва не поддерживает режим Асада и надеется, что Дамаск воспримет этот эпизод как предупреждение и изменит свое поведение.

Сирийская сторона выразила благодарность России и Китаю за то, что они не пропустили в СБ ООН резолюцию, предусматривавшую санкции против официального Дамаска, заявил полномочный министр посольства Сирии в Москве Сулейман **Абу Дияб**. *"Мы, сирийцы, очень благодарны России и Китаю за эту позицию"*, — сказал он "Интерфаксу".

Представитель Китая при ООН заявил, что Пекин выступил против "идеи о вмешательстве во внутренние дела Сирии", добавив, что санкции или угроза санкций могут еще более осложнить ситуацию в этой стране. Китайский представитель объяснил вето тем, что КНР принципиально против санкций или угрозы санкций, использована в качестве предлога для силовых акций.

Это слова. А что за ними?

Чем на самом деле вызвано российско-китайское вето? The New York Times пишет, что Москва и Пекин опасаются утратить влияние в арабском мире в ситуации, когда "авторитарные правительства, построенные по ныне обветшавшей советской модели, одно за другим терпят крах". Кроме того, они защищают свои военные и коммерческие цели. В случае России это база ВМФ в Тартусе и ежегодные сделки на миллиарды долларов. Кроме того, Сирия — единственный надежный друг России среди арабских государств, обеспечивающий выход на арабо-израильские переговоры о мире.

Россия и Китай, которые далеки от настоящей демократии, с тревогой относятся к "арабской весне" в целом, так как она может послужить примером для их собственных народов, — сказал в интервью Le Monde заместитель директора парижского Института международных и стратегических отношений **Дидье Бийон**.

Подготовил к печати Сергей ИВАНОВ.

Што там, ў Сірыі?

Сірыйскія войскі і спецслужбы затрымалі каля 3 тысяч чалавек пасля захопу паўстанцкага горада Растан. Пра гэта паведаміла агенцтва АР, спасылаючыся на мясцовую апазіцыю.

Бой за горад цягнуўся 5 дзён. У барацьбе загінулі некалькі дзясяткаў чалавек, каля 3 тысяч было затрымана.

Паводле падлікаў праваабарончых арганізацый, у антыўрадавым паўстанні ў Сірыі загінула каля 3 тысяч чалавек. Між тым Расія і Кітай заблакіравалі ў Савеце Бяспекі ААН рэзалюцыю супраць сірыйскага прэзідэнта Башара Асада, якая прадугледжвала жорсткія меры для яго, калі ён не спыніць вайну супраць свайго народу.

У Даніі новы ўрад

У Даніі сфарміраваны трохпартыйны левы ўрад.

Упершыню ў гісторыі краіны прэм'ерам стала жанчына — старшыня сацыял-дэмакратычнай партыі Хэльле Торнінг-Шмідт.

Турцыя адмовілася ад расійскага газу

Міністр энергетыкі Турцыі Танэр Ілдыз заявіў, што яго краіна адмаўляецца ад закупак газу, які паступае з Расіі па "заходнім маршруце" праз Украіну, Румынію і Балгарыю.

Як тлумачыць турэцкі бок, з Масквой не атрымалася дамовіцца аб зніжэнні кошту ў тым памеры, які задаволіў бы Анкару.

Жертва массовых беспорядков в Каире.

СОСЕДИ

Радослав СИКОРСКИ: *«У Лукашенко еще есть шанс пойти дорогой Ярузельского»*

Евросоюз и Польша, в частности, "не должны бойкотировать Лукашенко", заявил в интервью БелаПАН министр иностранных дел Польши Радослав Сикорски.

Он считает, что белорусского официального лидера следует "поощрять, если он сделал что-то положительное, и наказывать, если сделал что-то вопреки европейским ценностям".

Евросоюзу необходимо продолжить по отношению к Минску "политику выставления условий", подчеркнул глава польской дипломатии. *"Если Лукашенко выпускает людей из тюрем и ослабляет гайки, как это было перед выборами 2010 года, то мы с ним разговариваем, предлагаем продолжать такой курс. Если он сажает своих оппонентов в тюрьмы — тогда надо накладывать санкции"*, — пояснил Сикорски.

На вопрос, не кажется ли ему, что у объединенной Европы нет действенных рычагов влияния на Беларусь, министр иностранных дел председательствующей в ЕС Польши, в частности, ответил: *"Наибольшее влияние на события в Беларуси имеют сами белорусы. Сейчас ситуация в Беларуси контролируется президентом и его окружением, а нам хотелось бы, чтобы ее контролировал белорусский народ".*

По мнению Сикорского, *"судьба диктаторов, которые в последние месяцы потеряли власть"*, — повод задуматься для белорусского руководства.

На вопрос, считает ли Сикорский, что белорусский режим способен меняться, демократизироваться, глава МИД Польши ответил: "Лукашенко еще не поздно пойти дорогой Ярузельского, который сейчас живет в своей стране и которого недавно навестил в больнице Лех Валенса".

При этом польский министр назвал "чушью" заявления белорусского руководства о том, что жесткая политика Варшавы по отношению к официальному Минску объясняется притязаниями Польши на значительную часть белорусской территории. Министр сообщил, что польский МИД намерен вызвать посла Беларуси и заявить ему решительный протест, поскольку "мы не можем терпимо относиться к таким ничем не обоснованным высказываниям".

УЧИТЕСЬ!

Как выйти из кризиса?

Руководители многих стран озабочены этим вопросом. Озабочено им и правительство Беларуси. И принимает определенные меры. Но те ли?

В мире уже не раз решалась подобная проблема. Достаточно заглянуть в историю и поискать там ответ на поставленный вопрос. Сайт InoPressa.ru приводит, в частности, идеи для реанимации экономики, которыми делится в газете The Washington Times **Джим Пауэлл**, научный сотрудник американского Института Катона.

Следует взять пример, во-первых, с немецкого экономиста **Людвига Эрхарда**. *"После Второй мировой Германия превратилась в горы развалин, миллионы людей остались без крова, безработица приобрела массовый размах"*, — напоминает автор.

Эрхарда назначили министром экономики в Экономическом совете администрации союзников. 20 июня 1948 года он объявил о вводе новой валюты — немецких марок, которые будут выдавать в обмен на обесценившиеся "рейхсмарки". Он также отменил контроль властей над ценами, разъяснив, что эта мера искусственно создает дефицит, поскольку *спрос превышает предложение.*

"На прилавках в одночасье появились товары, которые немцы припрятывали в ожидании шанса на бартер. Немцы начали тратить новую валюту. Рост цен дал понять предпринимателям, что на увеличении производства можно заработать, и вскоре цены снизились", — повествует автор.

Эрхард отменил контроль над рынком валюты, чтобы поспособствовать торговле, а затем начал снижать налоги, чтобы у фирм было больше денег на наем рабочей силы, а у потребителей — больше денег на траты. В итоге ФРГ заняла второе место в мире по экспорту.

Второй образец для подражания — **Март Лаар**, учитель истории, который в 1992 году в 32 года стал премьер-министром Эстонии. Стране предстояло преобразовать плановую экономику в рыночную. *"Лаар ратовал за приватизацию, свободу торговли, плоскую шкалу налогообложения и твердую валюту"*, — пишет автор.

После отмены бюджетных субсидий госпредприятия обанкротились, зато удалось сократить расходы и обуздать инфляцию. Лаар упростил процедуру открытия новых фирм, отменил торговые ограничения, возникла благоприятная атмосфера для инвестиций.

Третий пример — **Пол Волкер** на посту главы ФРС США. В 1970-е годы президенты США столкнулись с проблемами инфляции и безработицы. "Великая инфляция" началась еще в 1960-е, когда Джонсон увеличил ассигнования на социальную сферу и одновременно форсировал войну во Вьетнаме. Когда по инициативе Никсона ФРС увеличила денежную массу, чтобы снизить инфляцию, вышло наоборот — цены и процент безработных выросли.

Волкер, назначенный на свой пост Картером, сознавал, что инфляцию нужно остановить. Его антиинфляционные меры твердо поддержал новый президент, Рейган. Инфляция была побеждена, Рейган убедил Конгресс снизить на 25% налоги на предельный доход, отменил контроль цен на нефть и бензин, и начался большой экономический бум.

ПОДХОД

Предложат туристам 10 тысяч бесплатных туров

Японское бюро по туризму намерено предложить иностранным путешественникам 10 тысяч бесплатных туров по стране в 2012 году, сообщает Agence France-Presse со ссылкой на японскую газету Yomiuri Shimbun.

Для того чтобы принять участие в акции, которая должна начаться в апреле, иностранцам необходимо будет заполнить электронную анкету и указать те районы страны, которые они хотели бы посетить. Из всех поданных заявок бюро выберет 10 тысяч победителей.

Правительство оплатит туристам авиаперелет, но о проживании и прочих расходах им придется заботиться самостоятельно. Единственное, что требуется от самих участников акции, — отчет о путешествии, опубликованный в интернете.

Японские власти надеются таким образом поднять привлекательность страны среди туристов по принципу "сарафанного радио" и восстановить туристический рынок, пострадавший в 2011 году. Массовый отток туристов начался после мощного землетрясения и цунами 11 марта 2011 года. Из-за удара стихии на АЭС "Фукусима-1" произошла авария, которая привела к утечке радиации.

АКЦЫЯ

Здаць зброю!

Актывісты праваабарончай арганізацыі Amnesty International у панядзелак, у Сусветны дзень супраць смяротнага пакарання, патрабавалі ад Беларусі адмены смяротнага пакарання. Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе і на постсавецкай прасторы, дзе ўсё яшчэ караюць смерцю.

Чаму адмена смяротнага пакарання ў Беларусі настолькі важная для Еўрасаюза?

На гэтае пытанне паспрабавала адказаць **Розмары ТОМАС**, пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі.

Падарожнічаючы па Беларусі, я ўвесь час бачу горкія помнікі неверагодным ахвярам і пакутам, якія вынесла гэтая краіна падчас Другой сусветнай вайны.

Іх маштабы пачынаеш разумець у Брэсцкай крэпасці, у Хатыні, каля мноства ваенных мемарыялаў у самім Мінску. Але вастрэй за ўсё іх адчуваеш, калі сустракаеш ветэранаў вайны і тых, каму давялося яе перажыць — тады па-сапраўднаму адчуваецца, наколькі свежыя тут раны гэтага страшнага часу ў гісторыі Еўропы.

Па сканчэнні вайны еўрапейцы былі поўныя рашучасці загаіць гэтыя раны і зрабіць усё магчымае, каб гэтыя жахі ніколі больш не пакрылі ганьбай наш кантынент. Галоўнай задачай стала аднаўленне веры ў тое, што чалавечая годнасць кожнага — неад'емная і канчатковая каштоўнасць для нас усіх.

Зняважыць яе — значыць прынізіць усіх нас. Менавіта таму Еўропа праводзіць паслядоўную працу па адмене смяротнага пакарання на ўсім кантыненце.

Дасягненні апошніх гадоў у гэтай галіне бясспрэчныя — да 2009 года ўсе еўрапейскія краіны, за адным толькі выключэннем, адмянілі альбо ўвялі мараторый на смяротнае пакаранне. Гэта адзінае выключэнне — Беларусь, у якой зусім нядаўна, у ліпені гэтага года, прывялі ў выкананне два смяротныя прысуды.

Адмена смяротнага пакарання магла б значна паскорыць інтэграцыю Беларусі ў еўрапейскія структуры, бо адкрыла б ёй шлях да сяброўства ў Савеце Еўропы, агульнаеўрапейскай арганізацыі са

штаб-кватэрай у Страсбургу. Сяброўства ў СЕ стала б стратэгічным выйгрышам для Беларусі, надаўшы значную глыбіню і значна пашырыўшы гарызонты яе шматвектарнай замежнай палітыкі, пра якую так шмат гаворыцца. І самае галоўнае, такое сяброўства дало б беларусам больш магчымасцяў і больш інструментаў для выбару імі найбольш пажаданай мадэлі развіцця грамадства.

Несумненна, надыдзе дзень, калі Беларусь стане сябрам Савета Еўропы. Але важным этапам на шляху да гэтага будзе яшчэ адна падзея ў еўрапейскай гісторыі — дзень, калі Еўропа стане першым у свеце кантынентам без смяротнага пакарання. У гэты дзень маленькая краіна ў самым сэрцы нашага кантынента будзе святкаваць адно са сваіх найвялікшых дасягненняў і ў той жа час рэалізацыю нашай агульнай мары пра адзіную і свабодную Еўропу.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
11 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.

ЛЁСЫ

Ні пры жыцці, ні пасля смерці

Страшная вясковая гісторыя пра тое, як знік чалавек

Цела 81-гадовага Васіля Сцяпанавіча Латушкіна знайшлі 8 ліпеня 2010 года, праз паўгода пасля таго, як мужчына знік. Знайшлі недалёка ад ягонага ўласнага дома, што ў вёсцы Глінніці Талачынскага раёна Віцебскай вобласці.

Дакладная прычына смерці пажылога мужчыны яго родным не вядома і па сённяшні дзень...



Знікненне

Апошні раз дачка Васіля Сцяпанавіча Галіна Халецкая бачыла яго 6 снежня 2009 года ў роднай вёсцы. "Я прыехала ў Глінніці наведаць бацьку, — узгадвае жанчына. — 6 снежня мы бачыліся з ім у апошні раз — ён правёў мяне, калі я збіралася ехаць у Мінск. З'язджаючы, я запаліла святло ў ягоным пакоі і на верандзе дома — час быў зімовы, на вясковай вуліцы было цёмна, а бацька любіў пахадзіць па двары. Каб яму было зручней, мы заўжды запальвалі святло на падворку і ў хаце..."

Днём 8 снежня, праз два дні пасля ад'езду з бацькоўскай хаты, на мабільны тэлефон Галіны Халецкай патэлефанавала сацыяльны работнік, якая апекавала Васіля Сцяпанавіча. Устрывожаная жанчына паведаміла Галіне, што святло ў доме гарыць, а гаспадара няма...

"Я імкнулася адганяць ад сябе дурныя думкі, — прызнаецца Галіна Халецкая. — Усё верыла, што бацька вось-вось знойдзецца. Думала, можа, дзе заблукаў і хутка прыйдзе дамоў..."

Але ні праз дзень, ні праз два Васіль Сцяпанавіч дома не аб'явіўся.

Сваякі звярнуліся ў міліцыю. Была заведзена пошукавая справа. Апытанне сведак, суседзяў і ўсіх, хто мог хоць што-небудзь ведаць пра месца знаходжання Васіля Сцяпанавіча, нічога не дало: ніхто мужчыну ў дзень ягонага знікнення не бачыў.

"Мы літаральна збіліся з ног, шукаючы яго, — гаворыць Галіна. — І самі, і з міліцыяй разам літаральна метр за метрам абследавалі вёску. Ніякіх слядоў. Потым да пошукаў прыцягнулі салдат — таксама безвынікова. Шукалі бацьку паўсюль: у бліжэйшых вёсках, у лесапаласе, на могілках... Але ніякіх звестак пра ягоны лёс не было. Я нават у царкве ўжо свечкі за спакой ягонай душы ставіла, але святары забаранілі гэта рабіць, сказалі, што пакуль бацьку не знойдуць — ён жывы. У царкве запэўнілі, што Бог абавязкова дашле нам вестку пра яго".

Знайшлі Васіля Сцяпанавіча толькі праз паўгода — 8 ліпеня 2010 года. Знайшлі выпадкова. Мясцовы трактарыст звярнуў увагу на тое, што ў дрэнажнай канаве нешта ляжыць... Ад месца, дзе знайшлі Васіля Сцяпанавіча, да яго ўласнага дома не больш за 400 метраў. Чаму ўвесь гэты час ніхто, у тым ліку і міліцыя, не бачыў яго ў той канаве — не вядома. Па адной з версій, знайсці Латушкіна раней не дазволіў снег...

Калі Галіна Халецкая прыехала на апазнанне бацькі, яе чакала шакіруючая навіна: аказваецца, чэрап Васіля Сцяпанавіча знайшлі крыху ў баку ад ягонага тулава. Труп быў без галавы...

Крымінальную справу па факце смерці Васіля Латушкіна не заводзілі. Згодна з заключэннем эксперта, "улічваючы развіццё позніх трупных змяненняў (скелецірованне), устанавіць прычыну смерці немагчыма". Пры гэтым слядоў гвалтоўнай смерці Васіля Латушкіна, па заключэнні экспертаў, не было знойдзена. Той факт, што чэрап мужчыны знаходзіўся асобна ад тулава, эксперты патлумачылі так: маўляў, адгрызці галаву ад шыі маглі жывёлы ці птушкі.

"З самага пачатку мы не надалі гэтаму факту значэння, — гаворыць Галіна Халецкая. — Мы таксама не задаваліся пытаннямі, чаму і як бацька апынуўся там, дзе яго знайшлі. Проста былі рады, што, нарэшце, цела знайшлі, што мы зможам яго па-чалавечы пахаваць. Але прайшоў час і прыйшлі пытанні".

Пасля таго як труп Васіля Латушкіна быў знойдзены, міліцыя, як і належыць, апытала сваякоў нябожчыка. Напрыклад, аб тым, ці вядома ім што-небудзь аб непрыязных адносінах Васіля Сцяпанавіча з кімсьці з аднавяскоўцаў.

"Я пра гэта нічога не ведала, я і зараз не магу нікога абвінавачваць у смерці бацькі — сведкаў яго знікнення няма, экспертыза не выявіла слядоў гвалтоўнай смерці, ні пра якія ягоныя канфлікты з кім-небудзь я не ведала", — гаворыць Галіна.

Хаця быў у мужчыны свой асабісты боль. З гэтым болем у душы Васіль Латушкін жыў увесь пасляваенны час — амаль 60 гадоў...

«Паліцай»

Вялікую Айчынную вайну Васіль Латушкін сустрэў трынаццацігадовым хлапчуком. Фашысты ўгналі юнака ў Германію. Там ён працаваў на вайсковым аэрадроме. У 1945 годзе ён разам з іншымі ўгнанымі ў Германію быў вызвалены амерыканскімі салдатамі.

Пасля вызвалення трапіў у Ленінабад Таджыкскай ССР, там і ажаніўся. Працаваў Васіль Сцяпанавіч вольнанаёмным рабочым у вайсковай часці Мінабароны СССР. На малую радзіму, у вёску Глінніці, Латушкін вярнуўся ў жніўні 1949-га і тут жа быў арыштаваны "за здраду радзіме". Вайсковым трыбуналам у красавіку 1950 года Васіль Латушкін быў прыгавораны да 10 гадоў пазбаўлення волі.

А потым была смерць Сталіна, перагляд спраў, і ў сакавіку 1955-га Латушкіна вызвалілі. Аказваецца, не было ў яго дзеяннях складу злачынства, пяць гадоў сядзеў у лагеры нізашто. Адным словам, у 1955 годзе Васіль Сцяпанавіч быў цалкам рэабілітаваны і адноўлены ў правах... Усе дакументы наконт сваёй рэабілітацыі Васіль Латушкін беражліва захоўваў да апошняга дня. Аднак у роднай вёсцы да яго прыляпілася мянушка — "паліцай". І паміж сабой некаторыя аднавяскоўцы ўсё ж такі называлі Васіля Латушкіна здраднікам, складалі пра яго розныя страшныя легенды.

Што рабілася на душы ні ў чым не вінаватага чалавека — ведаў толькі ён адзін, ні з кім гэтым сваім болем ён не дзяліўся. Толькі паўтараў: "На маіх руках няма крыві. Ні рускага, ні немца..." Але на беспадстаўныя абвінавачанні ў супрацоўніцтве з фашыстамі заўжды рэагаваў балюча, бараніў свой гонар да самай смерці. Як высветлілася, апошні інцыдэнт з "паліцэйскім" мінулым Латушкіна ўзнік незадоўга да ягонага знікнення.

Было гэта ў лістападзе 2009 года. І на аднаго з суседзяў Латушкіна нават быў складзены адміністрацыйны пратакол па факце "выказвання выдуманых звестак аб быццам бы спаленні вёсак разам з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны". Аднак 17 снежня суд Талачынскага раёна справу гэтую не разгледзеў і закрыў "з-за адсутнасці заявы пацярпелага". А Васіль Сцяпанавіч ужо не мог гэтую заяву падаць фізічна, бо знік якраз за некалькі дзён да суда.

Зразумела, што ў свеце ўсіх абставін тут могуць узнікнуць розныя думкі.

"Мне здаецца, што я вельмі мала зрабіла для бацькі, — гаворыць Галіна Халецкая. — Ён столькі перажыў, перанёс. А я нават высветліць не магу, як ён памёр. Мне вельмі балюча ад гэтай невядомасці. Усё, што я магу зрабіць для бацькі, — высветліць усё пра апошні дзень ягонага жыцця...".

Пасля таго як мінуў першы шок ад страты блізкага чалавека, Галіна Халецкая стала дабівацца ад праваахоўных органаў адказаў на пытанне: ці сапраўды смерць яе бацькі была няшчасным выпадкам?.. Але нічога ўцямнага не дабілася.

Алег ВОЛЧАК: «Праверка па факце смерці Латушкіна была недасканалай...»

Тады жанчына звярнулася да праваабаронцаў. Старшыня зарэгістраванага ў Кіеве праваабарончага цэнтра "Прававая дапамога насельніцтву" лічыць, што расследаванне па факце смерці Васіля Латушкіна было няпоўным:

— Як у былога следчага пракуратуры ў мяне адразу ўзнікла пытанне: як супрацоўнікі міліцыі шукалі чалавека і паўгода не маглі знайсці яго ў 400 метрах ад уласнага дома?

Калі пацярпелая Галіна Халецкая азнаёмілася з матэрыяламі праверкі, на падставе якіх і адмовілі ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, то стала зразумела, што матэрыялаў амаль няма, толькі некалькі тлумачэнняў і фотаздымак мёртвага Васіля Латушкіна. Вось і ўсё расследаванне. Быццам бы не чалавек знік, а нейкая непатрэбная рэч...

Таксама я звярнуў увагу на дзіўнае заключэнне медыцынскай экспертызы. Судова-медыцынскі эксперт без якой-небудзь навуковай аргументацыі прыйшоў да высновы, што чэрап Латушкіна аддзяліўся ад тулава ў выніку незахаваўшыхся мяккіх тканін, а не ад фізічнага ўздзеяння. Таксама эксперт указвае на тое, што ў памерлага не было пад'язычнай косткі, але калі не было фізічнага ўздзеяння, то якая прычына адсутнасці пад'язычнай косткі? Калі дапусціць, што чэрап аддзяліўся ад трупа ў выніку натуральных змяненняў, то чаму галава знаходзілася асобна ад тулава? Няма ніякіх прыкмет таго, што гэта магло адбыцца з-за птушак ці жывёл, таму што на чэрапе ніякіх знешніх бачных пашкоджанняў не было. Калі б птушка, якая дзяўбла труп, ці звер — гэта было б бачна. А то — нічога. Але галава ляжыць асобна.

Усё гэта, на мой погляд, сведчыць пра тое, што сам па сабе чэрап аддзяліцца ад тулава не мог. Пры гэтым ніякіх экспертыз, якія маглі б даказаць наяўнасць ці адсутнасць, напрыклад, поўсці жывёл ці валокан тканіны адзення іншых асоб на адзенні Латушкіна, не праводзілася. У мяне склалася ўражанне, што праверка па факце смерці Васіля Латушкіна праводзілася недасканала. І нельга выключыць, што перад смерцю ў дачыненні да Васіля Сцяпанавіча быў гвалт. Бо калі яго знайшлі, то верхняя вопратка на ім была расшпілена. А знік ён зімой...

Мы накіравалі скаргу ў пракуратуру Віцебскай вобласці, па справе Латушкіна была прызначана паўторная праверка. Мы спадзяваліся, што паўторная праверка будзе праводзіцца Галоўным бюро судова-медыцынскіх экспертыз. Аднак і паўторная праверка прайшла таксама павярхоўна — усё скончылася тым, што тлумачэнні даў эксперт, які праводзіў агляд трупа Латушкіна. Дарэчы, у гэтых тлумачэннях ён прызнаўся, што праводзіў толькі павярхоўны агляд трупа. Але і гэта ўсіх задаволіла. Вось вам і каштоўнасць чалавечага жыцця ў Беларусі!

Ніхто пры паўторнай праверцы не пацікавіўся тым, чаму пасля смерці Латушкіна на ягоным падворку знайшліся чужыя санкі, ніхто не шукаў раней судзімых асоб, якія напярэдадні смерці наведвалі Латушкіна... Ніхто абгрунтавана не даказаў, што чэрап ад тулава Латушкіна аддзяліўся ў выніку ўздзеяння птушак ці жывёл... Карацей, пытанняў у гэтай справе больш, чым адказаў. І дагэтуль няма яснасці ў галоўным: як і пры якіх абставінах памёр Васіль Латушкін?..

Няма ў нас павагі да людзей. Ні да жывых, ні да мёртвых.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗВАНОК У РЭДАКЦЫЮ

Няма рэгістрацыі — не будзе дома

"Ці праўда, што трэба хуценька пераафармляць лецішчы, бо хто не збярэ неабходных папер, у таго ў наступным годзе дачы адбяруць? Нейкая такая пагалоска пайшла. Хвалюемся. Патлумачце, калі ласка".

З такой просьбай звярнулася ў рэдакцыю Валянціна Іванаўна Семчыкава. І, як бывае амаль заўсёды, высветлілася, што няма дыму без агню.

Сканчаецца тэрмін, які быў вызначаны ўказам прэзідэнта №50 ад 28 студзеня 2008 года "Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садаводчых таварыстваў" для афармлення зямельных участкаў.

Згодна з пунктам 4 гэтага дакумента, грамадзяне, якім былі выдзелены зямельныя ўчасткі для вядзення калектыўнага садаводства, і тыя, хто набыў такія ўчасткі па дагаворах куплі-продажу ці іншым спосабам, але не з'яўляецца членам садаводчых таварыстваў і не зарэгістраваў свае правы на гэтыя зямельныя ўчасткі, павінны да 1 студзеня 2012 года звярнуцца ў адпаведную арганізацыю па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці для дзяржрэгістрацыі сваіх правоў на зямельныя ўчасткі і ўступіць у члены дзейных садаводчых таварыстваў або стварыць садаводчыя таварыствы. Дакументам пазначана, што невыкананне гэтага патрабавання сапраўды з'яўляецца падставай для канфіскацыі дадзеных зямельных участкаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

Дарэчы, як нам патлумачылі юрысты, домікі, якія пабудаваны на незарэгістраваных зямельных участках, не лічацца нерухомай маёмасцю грамадзян, а лічацца іх будаўнічымі матэрыяламі. Іншымі словамі, калі вы не аформіце свае правы на зямлю, то вас папросяць свае "будматэрыялы" з яе прыбраць.

ПРОИСШЕСТВИЯ

Ославил страну

Белорусский дипломат разбил в Вильнюсе три автомобиля

Как сообщают литовские СМИ, в конце прошлой недели в Вильнюсе, на перекрестке улиц Наугардуко и Альгирдо, советник посольства Беларуси Ярослав Диктиевский на автомобиле VW Jetta с зелеными дипломатическими номерами врезался в стоящий микроавтобус Renault, который в свою очередь протаранил стоящий автомобиль BMW.

Управлявший автомобилем белорусский дипломат не пострадал, в других машинах людей не было, и происшествие вряд ли привлекло бы внимание прессы, если бы не некоторые дополнительные детали. По словам сотрудников литовской полиции, которых активно цитируют местные издания, наш дипломат был совершенно пьян. Но, воспользовавшись дипломатическим иммунитетом, отказался пройти проверку алкотестером. Диктиевский объяснял полицейским, что очень устал на работе и заснул за рулем.

Полиция не могла задержать имеющего дипломатическую неприкосновенность советника, поэтому его пришлось передать приехавшим представителям посольства Беларуси (посольство находится рядом с местом происшествия). Прибывшие представители посольства сняли госномера с разбитого автомобиля. Его пришлось увезти — VW Jetta была разбита так, что сама ехать не могла. При этом сообщается, что водитель приехавшего другого автомобиля посольства набросился на снимающего происшествие журналиста LNK Яунюса Матониса. Не представившийся мужчина требовал не снимать и по-русски угрожал дать журналисту "по морде". Ему, правда, быстро объяснили, что он не в Беларуси, а потому должен успокоиться.

Прожорливый талончик

Мингорисполком предлагает увеличить стоимость одной поездки в общественном транспорте столицы до 1200 рублей.

Если Министерство экономики согласует новый тариф на городские перевозки пассажиров в коммунальном пассажирском транспорте столицы, то будет принято соответствующее решение мэрии. Сутки отводятся на информирование населения в СМИ.

В последний раз тарифы повышались в Минске 10 сентября: стоимость талончика на проезд была увеличена с 900 до 950 рублей за одну поездку.

Когда включат отопление?

Батареи потеплеют, когда среднесуточная температура на улице в течение 8—10 дней продержится на отметке около +10°С или пять дней не поднимется выше +8°С. Пока для включения отопления еще недостаточно холодно.

Уже с 1 октября коммунальщики ввели обязательное отслеживание температуры для того, чтобы можно было оценить ситуацию для начала отопительного периода.

Кстати, согласно нормам, после того как включат отопление, температура в жилых помещениях не должна быть ниже плюс 18°С.

Вылечить зубы про запас

В зубоврачебных кабинетах Гродно — очереди. Не потому, что люди начали больше болеть. Люди боятся повышения цен и лечат зубы про запас.

Как сообщает газета "Вечерний Гродно", услуги стоматологов дорожали в июле: в частных стоматологиях — в среднем на 50%, в государственных — примерно на 30%. Но люди, опасаясь нового скачка цен, уже не боятся этих цен и кинулись в кабинеты врачей.

Любоў да коцікаў павінна межы мець

Адно з асноўных палажэнняў падрыхтаванага ў Беларусі законапраекта "Аб абыходжанні з жывёламі" — абмежаванне ліку сабак і катоў, якія могуць утрымлівацца ў кватэрах. Пра гэта паведаміў намеснік загадчыка аддзела забеспячэння дзейнасці пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі ды прыродакарыстання Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу **Міхаіл Мацукевіч** на пасяджэнні "круглага стала" ў Мінску.

У адпаведнасці з праектам закона ў кватэры могуць утрымлівацца не больш за дзве жывёлы. Такое ж абмежаванне ўвядуць і для прыватных дамоў.

Паводле слоў Мацукевіча, асаблівая ўвага ў законапраекце надаецца пытанням уліку і рэгістрацыі свойскай жывёлы. Плануецца ўвесці абавязковае іх чыпаванне.

Рэгулююцца таксама пытанні адлову і ўтрымання жывёлы ў пунктах прыёму. Тэрмін утрымання — 14 дзён, адведзеных на пошук гаспадароў. Адлоўленыя жывёлы могуць адразу ж перадавацца на часовае ўтрыманне любому грамадзяніну або грамадскай арганізацыі з умоваю, што калі з'явіцца стары гаспадар, то сабаку або ката належыць яму вярнуць. Гэта дазваляе паменшыць выдаткі мясцовых бюджэтаў на ўтрыманне жывёлы. Калі за два тыдні гаспадар не знаходзіцца, жывёлу ўсыпляюць.

Аўтары законапраекта намагаліся ўлічыць інтарэсы ўсіх бакоў — ад арганізацый абароны жывёл да грамадзян, якія жадаюць абараніць сябе ад жывёл. У законапраекце прадугледжаны абмежаванні на знаходжанне з сабакамі на дзіцячых пляцоўках, дваровых тэрыторыях. У дакуменце запісана, што на выгуле сабака мае быць у намордніку і на ланцужку. Акрамя таго, гаспадары жывёл павінны прыбіраць за сваім гадаванцам адкіды жыццядзейнасці.

ТРАДИЦИИ

Денис РОМАНЮК: «Белорусы не боялись смерти»

Как правильно поминать предков? Зачем белорусы сооружали на могилах усопших деревянные саркофаги и кому вбивали осиновый кол? О мистическом и обыденном в жизни белорусов накануне Дня поминовения предков "Дзяды" нам рассказал известный фотограф, этнограф и издатель Денис Романюк.

Гроб несли на рушниках

Очень важная роль у наших предков отводилась белому домотканому полотну. Оно использовалось во всех белорусских обрядах и праздниках — при рождении ребенка, свадьбе, похоронах и т.д. На него клали и им же накрывали покойника. Считалось, что именно белое полотно создаст для умершего настоящую крышу, а не деревянная крышка гроба. Полотно наделяли магическими свойствами — оно служило защитой усопшему. Да и сам гроб несли на длинных рушниках, а не на веревках, как сейчас.

Осиновый кол для самоубийц

В давние времена медицина была не на высшем уровне, особенно в сельской местности, поэтому много детей умирало в младенчестве. И если малыша не успевали покрестить, то считалось, что данное рождение было неугодно Богу, раз Он не дал даже окрестить ребенка. Это было очень плохо. Поэтому на могилах таких деток нельзя было ставить крест. Вместо этого сажали дерево и украшали его ленточками, рушниками.

Не менее впечатляют и памятные знаки на могилах самоубийц. Поскольку это считается одним из самых страшных христианских грехов, их хоронили за оградой кладбища, а могилу засыпали пеплом, камнями, ветками или втыкали осиновый кол, повесив на него дохлую ворону. Смысл был в том, чтобы такая могила как можно быстрее исчезла. При упоминании осинового кола в памяти сразу всплывают многочисленные фильмы про вампиров. Самоубийца вампиром не становился, но он считался нечистым духом. И для того чтобы эта плохая душа не могла выйти наружу и вредить людям, и вбивали осиновый кол. В Беларуси сегодня совершается множество самоубийств. Конечно, в те времена статистика по суицидам не велась. Но их было однозначно меньше, чем сейчас, потому что, когда мы ездили с моим отцом, Михаилом Романюком, исследователем белорусской народной культуры, профессором, этнографом и фотографом, в экспедиции по разным регионам Беларуси, такие могилы самоубийц нам попадались редко. Видно, сильное осуждение и порицание односельчан, а также жуткий вид этих могил служили мощным предостережением от этого рокового шага. Меня очень впечатлило одно захоронение, которое мы встретили в деревне Рудня-Барталамеевская Чечерского района. Там тоже в могилу был вбит длинный осиновый кол, но он был украшен рушником и искусственными цветами... Так сильно родные самоубийцы скорбели о нем.

Белорусские пирамиды — «прыклады» и «навалы»

В определенных регионах Беларуси можно встретить надмогильные саркофаги, или по-белорусски — "прыклады", "навалы". На всю могилу клали дубовое бревно, которое считалось домом умершего и должно было успокоить его душу, чтобы он не тревожил живых. Могли построить имитацию дома в виде сруба — "наруб", в котором было маленькое отверстие, куда на поминальные праздники ставили еду для усопшего. Самое интересное, что кресты тоже стояли на таких могилах — тесное переплетение языческих и христианских традиций, что очень характерно для Беларуси.

Обракальные кресты

Форма белорусских надгробий сильно зависела от региона. Где-то устанавливали деревянный или каменный крест, а где-то считали, что достаточно положить на могилу валун. На Витебщине, к примеру, в основном доминируют кованые кресты.

